І маладосцю і красой,
А час міжволі распісаўся —
Крыху прыгнутаю спіной,
Сівой, бялявай галавой.

А ты —
На ўсё яшчэ харобры,
Не ўгледзеў, як твой час мінуў,
Калі ж у люстра глянуў добра,
Тады сваю мяжу адчуў
І толькі з болем уздыхнуў!

## АРУ ДЛЯ ЎСІХ...

Няўжо яно было такое
Святло з лучыны, з камінкоў.
Прайшлі часы перада мпою
Сахі драўлянай і цапоў.

Больш за паўвека долю стрэлі
І сталі мы на новы шлях,
Шырэла поле, мы дужэлі
І распрамляліся ў плячах.

Мы сталлю новы час падкулі,
Пусцілі ў ход электра, газ,
А што ўжо думкай сіганулі,
Дык за Юпіцер і за Марс...

Нам трэба гэтак, а няйначай,
Бо першымі мы мусім быць,
Я рады, што навокал бачу
Людзей, што й сілы пе злічыць.

Ды я і сам нібы са сталі,
Наш час складаней год былых,
Сабе дзяды й бацькі аралі,
А я сабе —
І дзеля ўсіх!

## А Я ЧАКАЮ...

Зіма, зіма... Вятры над гаем,
Шляхі снягамі замятае,
А я тых дзён, тых дрэў чакаю,
Як зашуміць зялёны строй
Між вішань з белаю фатой.

Ды ім не вечна красавацца,
І стануць кветкі асыпацца,
Я ж пажадаю дні пабачыць,
Калі ўсё поле ў каласах,
Куды ні пойдзеш — хлебны пах.

Ды песня жніўная спяецца
І зерне зберацца, звязецца,
Мне ж тыя дні усцешаць сэрца,
Калі галіны гне цяжар,
Нам несучы свой шчодры дар.

Ды кінуць неба Беларусі
Шпакі, і журавы, і гусі,
А я пабачыць зноў памкнуся
І першы, быццам пух, сняжок,
І першы, быццам шкло, лядок.

Нязменна дням жыцця мяняцца
І людзям з імі сустракацца,
І будзе лісце асыпацца,
І зноўку вішні зацвітуць...
Ды нам юнацтва не вярнуць.

## ПРЫХОДЗІЦЬ РАНІЦА
## Ў АКНО...

Вясной, амаль што кожны дзень,
Прыходзіць гэтак да мяне —
Праскочыць праз акно прамень
І разбяжыцца па сцяне...
На міг малінавым святлом
Ён на падстоллі заіскрыць,
То ўспыхне светлым матылём,
То здасца — крыллем зашуміць.
А за сцяной, штораз гучней,
Зазвоняць птушак галаскі,
Азвецца першым верабей,
За ім разыдуцца шпакі,
А там і ўвесь крылаты хор —
І спеў, і тлум, і грай, і свіст...
А там затахкаў і матор,
Паплыў у поле трактарыст.
А там і паравоз якраз
Вядзе сімфонію гудкоў,
А там загуў з цыстэрнай МАЗ,
Павёзшы з фермы малако.
А там кансервавы завод
Падаў гудок свой, паравы...
А там загуў і самалёт
З-пад Мінска ажно да Масквы.
А змоўк матор. З палёў чуваць,
З дзяўчат, з хлапцоў хтосьці заспяваў...
Ну дзе там, хіба можна спаць?
І я, ўсхапіўшыся, устаў!

## ЧАПАЙ ПА ВУЛІЦЫ ІДЗЕ...

Здаецца мне,
Што, смерць скарыўшы,
Жыве любімы наш герой —
Ідзе Чапай, Урал праплыўшы,
Па новай вуліцы сваёй.

А па-над ёю зоркі, зоры,
І чырвань сцягаў навакол.
Ідзе па гораду,
Каторы
Прамчаў калісьці, як арол.

Глядзяць у неба вежы смела,
Кварталы новых карпусоў.
Не, тут даўно
Няма ўжо белых,
Ні фабрыкантаў, ні купцоў.

Ані купчых, ні іхніх трантаў,
Ані тракцірных зазывал.
Ідуць на плошчу
Дэманстранты,
Грыміць «Інтэрнацыянал»...

І рады наш Чапай, вядома,
І думка вырасла свая;
Маё імя —
На кожным доме,
Дык значыць вуліца мая.

Далей Чапай ідзе ў калонах,
І вочы кратае слязой,
Чытае радасна:
Будзённы,
І Варашылаў, і Лазо.

А з вокнаў песні ручаямі,
І сэрца поўна пачуцця,
Дык вось яно,
За што з сябрамі
Не шкадавалі мы жыцця.

Ідзе Чапай. Яму ў народзе —
Усюды адкрываюць шлях,
На плошчу Леніна
Выходзіць,
І сэрца быццам звонкі птах.

## СПІЦЬ ЗЕРНЕ...

Прыкрылі снягі і палі і імшары.
І ціша. Гамоняць яліны адны...
Спіць зерне на складах,
                                        па свірнах і марыць,
Калі яго збудзяць прамені вясны.

Калі на машынах наведаюць людзі
Ды зноў адвязуць іх да роднай зямлі,
Калі пакладуць ёй на цёплыя ґрудзі
І дні веснавыя напояць, калі?..

А там ускалыша іх песняю вецер,
І лета прыгрэе сваёй цеплынёй,
А там, у калоссях, як золатца, дзеці
Памкнуцца да сэрца ізноў галавой.

А там пазбіраюць іх жніўнай парою
І шмат захаваюць у шчыльны засек,
Каб зноўку па кругу пайсці чарадою,
Як зерні за зернямі кружаць спрадвек!

## ЖЫЦЦЁ ПРАХОДЗІМ...

Жыццё праходзім крок за крокам,
Глядзім удаль, перад сабой
Ды прыглядаемся навокал
І ўвысь — над нашай галавой.

Трывожымся аб дзённым хлебе...
А даўшы волю перунам,
Нібы аўтографы на небе,
Маланка піша шчодра нам.

То выблісне на міг адзіны,
То зыркне, хоць пагляд хавай,
То ляжа поперак ялінай,
То ўскіне клічнік у канцы.

А то распішацца хвалiста,
То скрывіць росчыркаў стаўбцы,
То скончыць кропкаю агністай,
То ўскіне клічнік у канцы.

Мая ж, на боль, хавае памяць,
Ніхто не ведае аб тым,
Як распісалася вачамі
Даўно на сэрцы ты маім.

Ты распісалася як быццам
Зусім жартоўна, на бягу...
Я ж не магу дасюль забыцца,
Паставіць кропкі не магу.

## ЗА ЎСЁ ДАРАЖЭЙ...

Бязмежны космас. Зор без ліку
Відаць узброеным вачам.
І не такою ўжо вялікай
Зямля здаецца сёння нам.

Нас вабяць таямніцы далі,
Што з кожным днём усё бліжэй,
Зямля ж, дзе шчасце мы пазналі,
За ўсё на свеце даражэй.

Мепш космасу ў мільярдным разе,
Зямля, табе маё «люблю!..».
Ах, людзі, людзі... Мы ў адказе
За невялічкую Зямлю.

А на Зямлі забойствы, войны,
Прад здзекам атамаў дрыжыць...
Ну, дайце ёй пажыць спакойна,
Каб вам самім спакойна жыць.

Здабудзем розумам, рукамі
Ёй больш дажджоў і больш цяпла,
Каб гамапіла каласамі
І ў яркіх колерах цвіла.

* * *

Я, чым далей, павольней крочу,
Між вельмі прагных не крычу,
Я ўжо нікому не зайздрошчу
І лёгкай славы не хачу.

Маё найбольшае багацце —
У скарбах роднае зямлі.
Я дзякую жыццю і працы,
Яны далі мне, што маглі.

Далі мне моц, далі каханне
І, каб заўжды ў шуканні жыў,
На кожны ранак адчуванне,
Што я чагосьці не зрабіў.

Цяпер, каб як хацеў старацца,
Больш не зраблю і больш ярчэй,
Калі ж па шчырасці прызнацца,
Чаго б хацелася яшчэ?

Каб цвёрдым крокам, станам гнуткім
Гару мінаў я — за гарой
І каб гады не вельмі хутка
Адлічвалі мне тэрмін свой.

Я не прашу завельмі многа,
Каб хоць, як сёння, быў здароў,
Я ж па галоўную дарогу,
Здаецца, толькі і ўзышоў.

## ЛЮДСКОЕ СЭРЦА

У сэрцы нашым шмат прастору,
Яго не змераць сотняй міль,
Людское сэрца быццам мора,
У ім бывае шторм і штыль...

Без душ сяброўскіх жыць не можа,
Між імі ззяе, як маяк...
А буйны вецер растрывожа,
Не супакоіцца ніяк.

Ну што ж, у ім адценняў многа,
Калі б ні ціша, ні вятры,
Яно б не вабіла нікога
І хутка б згасла, без пары.

## НАВАСЁЛ

Как будто
пришел
к социализму в гости...
*Ул. Маякоўскі*

Як не надзівіцца Антон,
Нібы зямля не тая.
Зірк, узышоўшы на балкон,—
Іначай выглядае.

Нібы шырэй у гэты час,
Такі разлёт адчуўся,
Да небасхілу аж калгас
Ягоны разгарнуўся.

А вунь і лес і луг відзён,
Дзе пасвіць свой ён статак,
І задаволены Антон —
Нічога сабе хата.

Кватэру знаным пастухом
Запрацаваў аддана —
На тры паверхі новы дом,
Вышэйшы, чым у пана.

Ці мог падумаць ён калі
Аб гэтакім прасторы?..
Яшчэ падміргвае здалі
Ягоны панадворак,—

Што пры дарозе, ля сасны,
Сваімі ўзвёў рукамі —
Малая хатка ў два акны,
Паветка з хлеўчукамі.

І лазня, дзе ён печку склаў,
Зрабіў карыта з дубу,
І той асвер, што, як жураў,
Застыў з даўжэзнай дзюбай.

Ён там пражыў час доўгі свой,
І знаюць усе — пягожа.

Але, як сёння, дык такой
Не ведаў ён раскошы —

Жыві сабе, не знай пакут,
Адно — працуй старанна.
У тры пакоі новы кут,
Ды да таго ж і з ваннай.

Малы кружочак толькі зруш,
Струмень, і адмысловы —
Цялёпкайся, а хочаш — душ,
Як дожджычак ліпнёвы.

А трэ — мачалкай так і сяк
Ты можаш шаравацца...
Шкада, што венічкам ніяк
Там нельга пахвастацца.

Цяпер, у гэтыя гады
І парыцца не кожны.
Але, каб толькі той бяды,
Без веніка жыць можна.

Затое ў трубах ёсць цяпло,
А трэба — прахалода,
А ў вокнах сонейка, святло,
Кватэра — асалода!

А ўранку, каб на працы быў,
Дык радыё гукала...
Не, так ніколі ён не жыў —
Пастух Антон Гурала.

* * *

А быў ён, слоў гусіны статак,
Крыклівы, ды без ладу ў ім —
Паэзіі маёй пачатак
Быў і складаным і цяжкім.

Як па жвіры, ішоў я босы,
Мяне калола і пякло,
Душа ірвалася ў нябёсы,
Ды ведаў-крылляў не было.

І я, як тая рыба, біўся,
Як свой кірунак выбіраў,
І ў недавучаных вучыўся,
Недапаэтаў прызнаваў,—

Пакуль не выбіўся, як трэба,
Бо верыў, смела ўдаль глядзеў
І чорнаму не здрадзіў хлебу,
Які з вялікім смакам еў.

## АПОШНІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

Ад рання да ночы, нязменна
Ўвесь час, калі толькі не ў сне,
Апошнія паведамленні,
Як ежа, патрэбныя мне.

Дзе ў свеце здарэнне якое,
На доле ці ў стромых гарах,
Лятуць яны з кулі зямное
Па розных, нябачных шляхах.

І з радасці, шчасця ці з гора,
То словам, то слоў ручаём,
То ветрыкам свежым адораць,
То раптам ударацць як гром.

Найболей жа ціха і роўна,
Жадаючы весткі падаць...
Ды сэрцу усё ж неспакойна,
Яму ж усё хочацца знаць.

І як там, што ў шахтах здабыта,
І сталі зварылі ці шмат?
І як наліваецца жыта,
І як, ці наспеў вінаград...

І як там, наколькі наперад,
За волю прайшлі змагары,
І як там ідуць піянеры,
Ці зырка гараць іх кастры?

І як там, калі давядзецца,—
У космас ляцець і каму?..
І з песняй таварыша стрэцца
І мо пазайздросціць яму.

А можа, і ўздыме натхненне,
Што хутка канец і вайне...
Апошнія паведамленні,
Як ежа, патрэбныя мне!

## А ДНІ, ШТО МАЛАНКІ, У НАС...

А дні, што маланкі, ў нас,
За тыднямі — месяц, год...
Вазьмі мяне, новы час.
Вазьмі мяне ў свой паход!

Вядома — я не прыстаў,
Нямала й хачу пажыць —
На вахту любую стаў,
Я ведаю, што рабіць.

Пайшлі мяне ў стэп, таёгу,
Ты будзеш здабытак мець,
Адно, чаго не магу,—
На Месяц і Марс ляцець.

Я дужы. Да снежных гор
З нізіны ж узняцца змог,
Ні вецер, ніякі мор
Ніколі не збілі з ног.

Хай цяжка было рукам,
Мяне не зламаў і боль.
Не пагражала грудзям
Ніякая ў свеце моль.

Я выстаяў многа раз
Супроць немалых нягод,
Вазьмі мяне, новы час,
Вазьмі мяне ў свой паход!

## ВОЙНЫ Б НЕ З'ЯЎЛЯЛІСЯ...

Войны ўсякія былі,
Шмат ад іх бядачылі —
Пачыналі са стралы,
Са смалы гарачае.
Ямы ладзілі, равы...
Стаўшы сілай ратнаю,
Падышлі да булавы,
Да мяча булатнага.
А пасля пайшлі палкі
З рознымі брыгадамі —
Кулі, шаблі і штыкі,
Бомбы са снарадамі.
Танкі з жудасным агнём
Рушылі лавінамі,
Засыпалі, як дажджом,
Мінамёты мінамі.
А вайна мацнее, чуць,
Што ні год навінкамі...
Самалёты смерць нясуць
Атамнай начынкаю.
Досыць войнаў.
Час канчаць
З войнамі няспыннымі,
А дзе выйсце тое ўзяць?
Бачу я адзінае —
Каб народы ўсёй зямлі
Нашых дум трымаліся,—
Каб усталі, што зляглі,—
Войны б не з'яўляліся!

## РАЗМОВА З ЭЛЬБРУСАМ

Больш сорак год, як бачаць вочы
Цябе ў праменнай вышыні,
І я, Эльбрус, табе зайздрошчу —
Што не змяніўся ты ані.

Магутнаму, такое сілы,
Што ўзрос плячамі аж да зор —
Ды як зямля цябе стварыла,
Срабрыстага, між чорных гор?

Я, пастарэўшы, пасівелы,
Зноў рады гаварыць з табой,
Ты ж, як раней, крыштальна-белы,
З пязменна гордай галавой.

Ты, як маяк між чорнай ночы,
Далёка бачышся з нізін.
І я, Эльбрус, табе зайздрошчу,
Ды толькі хіба я адзін?

## МЫ ДЗЕЦІ ЎСЕ АДЗІНАЙ МАЦІ...

Гады праходзяць за гадамі
У бурных дзеях на зямлі...
Нямала зроблена і намі.
І чуецца: «...Вось мы былі!..»

Канечне, кожны на рабоце
Сябе дарэшты аддаваў.
Канечне, мы былі на ўзлёце
І ў самым пекле розных спраў.

Канечне, мы недасыпалі
І елі хлеб скупы з асцём.
Крыві нямала пралівалі,
Ахвяравалі і жыццём.

Канечне, з нас былі героі,
Адолеўшыя час цяжкі,
Затое бачылі такое,
Чаго не бачылі вякі.

Зрабілі мы ў сваёй Радзіме
Усё, каб далі расцвілі,
Але нашто прад маладымі
Хваліцца нам: «Вось мы былі!..»

Яшчэ няскончана дарога,
І прад нябачаным стаім.
Канечне, мы стварылі многа,
Ды хопіць спраў і маладым.

І гарту поўная, адвагі,
Сказаць нам можа маладосць,—
З пашанай, з добраю павагай:
— Так, вы былі!.. Мы ж сёння ёсць!

І гэта так! Яны аддана
Кладуць сягоння ў Заўтра шлях,

І праўда, варта толькі глянуць —
Якi ж узлёт, які размах!

У цаліну жыццё ўдыхнулі,
Партыйны здзейсніўшы наказ,
Яны і ў космас сiганулi,
Наш герб паклаўшы аж на Марс.

Ідуць сцяжынамі крутымі
З адкрыццяў верай у вачах,
І за ракетамі такімі,
Што нашым ворагам на страх.

Ах, як з іх кожны ганарыцца,
Што можа край абараніць!..
Навошта ж гэтак нам дзяліцца,
Хто што зрабіў, каму рабіць?..

А множым мы адно багацце,
І кожнаму час выпаў свой.
Мы дзеці ўсе адзінай маці,
І ўсе мы роўна любы ёй!

## СЯБРАМ-ПЕРАКЛАДЧЫКАМ

Мастацтва роднай Беларусі,
Як выраслі шляхі твае,
Бо дзе я, дзе ні апынуся,
Я чую —
                Беларусь пяе...

Паэзіі і нашай крылы
Узняты сотняй братніх моў!
Не, мы яшчэ не ацанілі
Яе шматлікіх галасоў.

Тых галасоў, што загучалі
Праз вусны родных нам братоў —
На струны ўласныя паклалі
Іх шмат выдатнейшых майстроў.

І палымнеюць песні ў сэрцах,
І праз вякі ім жыць і жыць...
І трэба ведаць,
                мне паверце,
Нялёгка гэткае рабіць.

Каб перадаць усім, як трэба,
Каб аж зайшліла ў грудзях,
Усю красу зямлі і неба,
Бароў і рэчак колер, пах...

Каб не забыцца ні чагосьці,
А асцярожна ўсё забраць,
Каб кубак дум і прыгажосці,
Наліты да краёў, падаць.

Каб з зачарпнутага з крыніцы
Данесці, кроплі не разліць,
Каб з кубка, што не замуціцца,
Даць чытачу усмак напіць.

І вось за гэту ласку, працу
Хачу падзякаваць я вам —
І масквічам, і ленінградцам,
Ва ўсіх рэспубліках сябрам.

За тое, што і наша слова
Ўлілося ў россып яркіх зор,
Што ўзнёслае з бароў сасновых
Гучыць між стэпаў і між гор.

## ВЯСЁЛКА

Ах, як нам вясёлкі ззялі
У юначую вясну!
А яшчэ Вясёлкай звалі
Камсамолку мы адну.

Усміхнецца, зарагоча,
Жарты з вуснаў агнявых...
А галоўка, твар і вочы —
Колькі колераў жывых.

Нас вясёлка ў высі звала,
Што з'яўлялася, як госць,
І паўнеба чаравала...
Ну, а наша — ўсіх, як ёсць!

Нас усіх яна скарыла,
Мы хадзілі чарадой,
А яна найболей кпіла,
А надзеі — ніякой.

Ды прыпала ж ёй, гарачай,
На адным пагляд спыніць...
З тых часоў — вясёлку ўбачу,—
Сэрца ў смутку зашчыміць!..

## АБЫ-ЯКОЙ НЕ ЗАСТАВАЙСЯ!

Каб старасць
Рана не спасцігла,—
Дай пагарэць сваёй крыві,
Не будзь, як халадзец, застыглай,
А ўсімі фарбамі жыві.

Ты перасудаў не лякайся,
Што людзі зложаць у паспех,
А ты мяняйся, ты мяняйся,
Як гнеў —
На любасць,
Плач —
На смех.

Прывабнага не адцурайся
І выпі шчасця поўны коўш.
І ты мяняйся, ты мяняйся —
Як змрок —
На сонца,
Суш —
На дождж!

## КАЎКАЗСКІЯ ЗАМАЛЁЎКІ

У сінь вышынь Каўказ прыбраны.
Між стромых гор —
Лугі, палі,
І, як зялёныя фантаны,
Таполі рвуцца з-пад зямлі.

І шум ядлоўцу па сцяжынках,
І клёкаты арла
Здалёк,
І гоман срэбнай ручаінкі,
Нібы гаранкі галасок.

А горы скрозь, куды ні выйсці.
Гняздо на іх —
То горца дом.
А скалы, скалы...
Хто калісьці
Насек іх дужым калуном?

Глядзіш на іх. Расце здзіўленне —
Ў бяздонне гледзячы
на дол,
Сасна трымаецца карэннем,
Як быццам кіпцямі арол.

А воблакі, нябёсаў хвалі,
Што пух,
Напоўнілі прастор.
Няздарма бога малявалі
На гэтых воблаках між гор.

## ЧАМУ Я ГЭТАК ВАС ЛЮБЛЮ?

Я не магу на вас забыцца,
Вы ўсе са мной,
Як нават сплю.
Не, вы скажыце, вы скажыце,
Чаму я гэтак вас люблю?

Бярозу тую — мнагаплачку,
Што ля бацькоўскага двара,
І тую рэчачку Вушачку,
Якой далёка да Дняпра...

І той лужок, дзе давялося
Брысці не раз між трыснягоў,
І той гаёк з кашлатых сосен,
Якім — куды да тапалёў!

І тую ўтульную мясцінку,
Дзе мы пілі кляновы сок,
І тую вузкую сцяжынку,
Што быццам жоўты паясок.

Чаму ж лавіць лічу найлепш я
У нашай ціхай рэчцы рыб,
Чаму здаецца прыгажэйшым
Мне ў нашым лесе кожны грыб?

Чаму ласкавей дождж цярушыць
І пах больш чуткі медуніц,
Чаму адменны смак у грушаў,
У сліў, у вішань, у чарніц?..

Я вас даўно
Пакінуў быццам,
Ды ўсе са мной, як нават сплю...
Не, вы скажыце, вы скажыце,
За што я гэтак вас люблю?!

## РАКА

З бароў, з дуброў
З крыніц, лугоў,
Дзе трыснягі,
Дзе асака —
Цячэ рака,
Цячэ рака...

Праз шум травы,
Праз паплавы.
Паміж палёў
І мурагоў —
Як ланцужок,
Як паясок.

Ёй пасабіць
Ручай бяжыць,
І чым далей,—
Рака шырэй,
Ды ўжо й відны
На ёй чаўны.

Паміж бяроз
Я з ёй узрос,
Лёс выпаў мой
Заўсёды з ёй
Ісці, плысці
Ва ўсім жыцці.

Пад гул гадоў
З ракоії ішоў,
Рака шмат раз
Вяла мне сказ,
Ляцела ўдаль
Гамонка хваль.

Шмат пекнаты
Схавала ты —

Кахання жар,
Юначых мар,
Гульні разбег,
Дзіцячы смех.

Але й жуды
Былі гады,
Што неслі кроў
Да берагоў.
Паўнела скрозь
Рака ад слёз.

Ды ў днях цяжкіх
Прагнала ўсіх
Ад берагоў
Ты чужакоў,
Свой змыла кут
Ад злых пакут.

Рака, мой лёс!
З табой я рос,
Я рад вітаць
І адчуваць,
Як ты плывеш,
Як ты пяеш!

## НЕБА

Дыханне ніў, і луста хлеба,
І радасць зроку, спеў галля...
Ах, неба,
неба,
неба,
неба —
Як прагне да цябе зямля!

Ты для зямлі — яе патрэба,
Ці ты ў яснопе, ці ў журбе.
Ах, неба,
неба,
неба,
неба —
Мы рвёмся змалку да цябе.

Як прагне тваёй ласкі глеба,
Твайго цяпла, дажджоў тваіх —
Ах, неба,
неба,
неба,
неба —
Краса ты колераў усіх.

То быццам шоўк, то быццам зрэб'е,
То крэп, разгневана калі...
Ах, неба,
неба,
неба,
неба —
Табе малюся і зямлі.

# II
# ПАЭМА

# ДУМА АБ БЕССМЯРОТНАСЦІ

## I

Палеткі ў сонечным убранні,
Між сосен вецер, што гусляр,
Мяне хвалюе заўжды ранне,
Нібы ў ім свет свой мые твар.

Я неба звон празрыста-сіні
Над зелянінай так люблю.
І вось я зноў у той мясціне,
Дзе ўпершыню стаў на зямлю.

Гляджу на ўзбуджаныя гоні,
Мінулых год вяду падлік,—
Іншы рытм у працы сёння,
Матораў розных пералік.

Машыны ўсё ўзялі на плечы,
Вядуць усюды гоман свой...
І скрозь па-за рулямі дзеці
Бацькоў, што сохлі за сахой.

Бацькоў яны пераганяюць
У кожнай справе, з кожным днём...
А я пра тых успамінаю,
Каму мы ўдзячныя жыццём.

Пры абеліску пры высокім
Стаю, скуль зорка ззяе нам,
Каб перадаць паклон глыбокі
Сваім таварышам-сябрам.

А зорка гэтак прамяніцца
Барвовай,
чыстай раніцой,
Як паглядзіш — над сонцам быццам
Наліта воінаў крывёй.

Яны ў сваёй зямлі ў спакоі
Ляжаць.
Жыццё ёй аддалі.
Я з вамі гавару, героі,
Калісьці разам мы раслі.

Кастрычнік даў нам змалку крылы,
На шлях далейшы ускрыліў.
Радзіма нас усіх вучыла,
З нас кожны ў справе майстрам быў.

Цяпер пад зоркаю агністай
Спіцё,
за волю змагары —
Настаўнікі, і трактарысты,
І кавалі, і цесляры...

І той,
хто цуд рабіў у садзе,
Хто пчаляром вядомым быў,
І проста тыя, хто ў брыгадзе
На працу розную хадзіў.

Яны загінулі ў змаганні,
Ім вецер рэквіем пяе...
Ляжаць там мсціўцы-партызаны,
Усе таварышы мае.

Ляжыць, на выбухі славутны,
З гадоў дваццатых камуніст —
Кузьма Пілюта. Даўна чутны
Ва ўсім раёне трактарыст.

Аб ім жывуць паданні сёння;
Быў храбрым партызанам ён —
Варожых многа эшалонаў
Праз ночы скінуў пад адхон.

Усё жыццё быў працавітым,
Ды і загінуў як герой.
Ён, мост знішчаўшы, быў забіты
Па-над Ушачкаю-ракой.

Калі калгас распачынаўся,
«Фардзона» некалі вадзіў,

Дастойна і ў вайну змагаўся...
Устань,
Пілюта,
паглядзі —

Прайшла фашысцкая навала,
Жыццё інакшае ідзе...
Глядзі,
як твой унук удала
Па полю «Беларусь» вядзе.

Машыну гэтую прыкмеціш
Далёка ты,
не толькі зблізь,
Ды гэты ж трактар,
знаны ў свеце,
Сягоння выпускае Мінск.

Цяпер наш трактар проста звычны,
Ды ўсе дзівіліся ў свой час.
Ты чуеш гул яго рытмічны,
Што далятае аж да вас.

Пры абеліску я чырвоным,
У гонар воінаў-бацькоў,
Гляджу на надпісы імёнаў,
Хто з грознай далі не прыйшоў.

Стаю, панікшы галавою,
І слова роздуму бяру:
— Я з вамі гавару,
героі,
Нібы з жывымі гавару.

Вы чуеце — гамоняць гоні.
Узняўся зноў наш родны дом.
Калі б усталі вы сягоння,
Сказалі б:
— Добра мы жывём!

Мы ўсё, як ёсць, адбудавалі —
Свой кут спрадвечны, баравы;
Мы так аддана працавалі,
Як працаваць хацелі вы.

Што зроблена — завём мы руннню,
Яшчэ вясновы наш паход,
І Ленін наш — ён вечна юны,
Хоць яму сёлета — сто год.

Ён заўжды,
скрозь
з працоўным людам,
На бой астатні іх узняў,
Ён тут між нас і ён усюды,
Яму на свеце многа спраў.

Ён на вякі дарогі значыць,
Яго заўсёды верны шлях,
У час цяжкі баёў гарачых
На баявых ён быў сцягах.

Ён вас ніколі не забудзе,
Ён рады вас усіх вітаць —
Вы ўбілі кол фашызму ў грудзі
Насмерць.
Хоць ён спрабуе ўстаць.

Дарма!
Яго падолеў вызнаць
У свеце кожны ўжо народ.
Прайшла мяжа сацыялізма —
Удаль на захад і на ўсход.

Хоць шмат яшчэ брахні атрутнай
На нас спрабуюць выліваць,
Ды пене іх агідна-бруднай
Магутнай плыні не стрымаць.

Мы ж моц сваю яшчэ патроім,
Заўсёды з намі — маладосць!
Я з вамі гавару, героі,
Што мы на варце ўсе, як ёсць!

II

Паўдзён. Я зноў пры абеліску,
Бо сэрца прывяло да вас,—
Да вас, мне родных, шчырых, блізкіх,
Звяртаюся. Мне чуць адказ.

Не скончыў з вамі я гаворкі,
Калі прыходзіў раніцой.
Цяпер паўдзён. Над вамі зорка
Здаецца ярка-залатой.

Яна з дзяцінства сустракае,
Пасля вядзе ў далёкі шлях,—
Гарэла некалі такая
У вас, між баек, на грудзях.

А вось цяпер яе найболей
Людзям за працу выдаюць...
Паўдзён ужо.
Чутно, як з поля
Усе на полудзень ідуць.

Каго вязуць дадому МАЗы,
Чакае іх жаданы дом.
Другім прывозяць, што ўсе разам
Палуднуюць сваім кружком.

А што ёсць лепш за круг сяброўскі,
Які прысядзе адпачыць...
А я гляджу — Ягор Макоўскі,
Ён паміж іх павінен быць.

Жартаўніком жа быў бясконцым,
Казалі:
— Ну й хлапец — арол!..
Аб'ехаў на паўтаратонцы
Усю акругу навакол.

Здавалася, не ведаў зморы —
Хоць суткі не заплюшчыць воч,—
Усе дзівіліся з Ягора,
Што за рулём і дзень і ноч.

Калі ж Макоўскі партызаніў,
Няхай хадзіў ён пехатой,
Яму ад рання і да рання
Тым больш нязнаны быў спакой.

Скрозь партызанская брыгада
Наводзіла на катаў жах,—

Ягор быў першым у засадах
На ўсіх дарогах і шляхах.

За гора роднай Беларусі
Вёў,
    помсцячы,
                рахунак свой,
Але аднойчы не вярнуўся
Ён з аперацыі адной.

І я, прыйшоўшы, па-сяброўску
Кажу яму:
            — Герой-арол,
Устань, Ягор!..
Устань, Макоўскі,
Прыглядзься добра навакол.

Прыслухайся —
                нібы варкуе
Матор на наш увесь калгас;
Ды гэта ж сын твой меншы, чуеш,
Павёў кудысьці дужы МАЗ.

Машынай можна ганарыцца,
Яна не знае перашкод.
Ды гэта ж, ведай, Мінск-сталіца
Іх вырабляе колькі год.

І гідрастанцыі краіны
Сягоння дзякуюць ім шмат,
Дзе клаўся ў дужыя плаціны
І беларускі наш уклад.

Будуем мы свой кут бацькоўскі,
І справа ў радасных руках.
Ты паглядзі, Ягор Макоўскі,
Якая школа!..
Што за гмах!..

Паміж вясковых ніў, сялібаў
Такою школа не была —
Высокі дах, па сажню шыбы,
У кожным класе шмат святла.

А вунь далей, вунь побліз лесу,
Узняўся за апошні час
Будынак у абдымках бэзу...
Ды гэта ж сад дзіцячы наш.

Кіруе дзецьмі там другая,
А мы з часоў вайны цяжкой
Аб партызанцы ўспамінаем,
Аб партызанцы-сувязной,

Што да вайны калісьці ў садзе
За выхавальніцу была —
У партызанскай жа брыгадзе
Разведкаю дапамагла.

Яна была — само бесстрашша,
Між куль хадзіла па начах.
Яе ж павесілі, спаймаўшы,
Ля роднай хаты ўсім на страх.

Я слову, што хачу прамовіць,
Кажу:
　　　— Ты Раю абудзі!..
Устань жа, Рая Галубковіч,
Устань жа, Рая, паглядзі!

Вунь колькі іх,
　　　　　　маленькіх,
　　　　　　　　　　мілых,
Бы кветнічак жывы гудзе,—
Адна з малых, што ты вадзіла,
Цяпер ужо другіх вядзе.

Мы рады,
　　　　шмат іх паўзрастала,
Як быццам кветак веснавых...
Ты ім жыццё ахвяравала,
І сёння ты жывеш між іх.

І я хілюся галавою
Да вас, як да сяброў сваіх:
Я з вамі гавару, героі,
Здаецца, бачу вас усіх.

У час, як смерць над светам вісла,—
Збавіцелі вы ўсёй зямлі.
Здаецца, бачу тых, што з Віслы,
З Дуная,
Шпрэе не прыйшлі,

Мы помнім іх і заўжды шчыра
Успамінаем, дзе яны,—
Яны ляжаць на варце міру...
А іх ахоўваюць сыны.

А іхніх спраў і думак крылы
Высока рушылі ў палёт,
Бо з намі Ленін —
поўны сілы,
Хоць яму сёлета сто год.

І сёння скрозь — усе краіны
Переканаў вялікі плён —
Паўдзён Савецкае айчыны,
Здзяйсненняў ленінскіх паўдзён!

III

Я вечарам сустрэўся з вамі,
Пакуль няма бліскучых зор,
Ён прыкрывае, што сцягамі
Чырвонымі, зялёны бор.

Туман прыўзняўся над ракою.
Спачыць збіраецца калгас.
А я да вас прыйшоў, героі,
У гэты вечаровы час.

Зямлі айчыннае дазорцы,
Далі вы нелюдзям урок.
Стаю іззоў пры вашай зорцы,
Што як чырвоны агапёк.

Агні ўсіх хутка пасклікаюць.
І птушкі ўжо імкнуць да гнёзд.
А я цябе прыпамінаю,
Стары пчаляр Мікола Дрозд.

Было яно вайной.
Уночы
У вёсцы фрыцы загулі —
Так да цябе ў твой дом аднойчы
На агапёк яны прыйшлі.

Пра мёд дазналіся дакладна,
Давёў ім паліцай-жандар;
Спыталі быццам далікатна:
— Ану, дай мёду, гер пчаляр.

Пра шынку павялі развагі,
Пра агуркі,
пра іх засол...
Яны ж паклалі для павагі
Бізун і пісталет на стол.

І ты, як мог,
гасцей забавіў,
З пашанаю падносіў сам.
Ды што казаць — усё паставіў,
Як добрым некалі людзям.

І фрыцы прагна пілі, елі,
І хтосьці «Гітлер хайль» крычаў,
Але як трэба пахмялелі.
Такую ты закуску даў,

Што ад таго твайго частунку
Ім мала што дапамагло б.
Раўлі жахліва:
— Гвалт!.. Ратунку!..
Ды вочы вылезлі на лоб.

Ты вызначыў для іх дарогу,
Як злосным трутням, чорнай тлі,
А сам уцёк.
Ды ненадоўга.
Цябе эсэсаўцы знайшлі.

Ты смела стрэў канец гвалтоўны,
З пятлёй, на ўласным жа двары...
Ты спіш, Мікола Дрозд шаноўны,
Паміж сваіх, пчаляр стары.

Устань жа, глянь па край вясёлы,
На свой ізноў абжыты кут.
Ты паглядзі, што нават пчолы
Цябе наведваюць і тут.

Ніводзін вулей не пакінуў
Цябе.
        Працуе дацямна.
І кожны іх палёт пчаліны —
Нібы звінячая струна.

А пасека цяпер такая,
Што йдзе рашуча навырост,
А твой застунца ўспамінае
Пра вас усіх,
                Мікола Дрозд!

Мы з вамі ўсёю грамадою.
Мы з вамі кожны, кожны дзень.
Схіліўся я пры вас,
                          героі,
І мой схіліўся доўгі цень.

Ужо і вечар травы росіць.
І сонца жухне, не пячэ,
Хоць на вяршынях гонкіх сосен
Яно гушкаецца яшчэ.

Ды праца скончана сягоння,
Хай цемра між ялін густых,
Ды з клуба светлага гармонік
На вечар кліча маладых.

І клуб з вучобай і з гульнёю,
Як муравейнік той жывы...
Я з вамі гавару, героі,—
Усё заваявалі вы.

На абеліск кідаю вока,
Дзе землякоў імёнаў шмат,
Што не прыйшлі з франтоў далёкіх...
Між іх —
              Янута Беласад.

Наканавала табе доля
Быць пехацінцам між байцоў.
Ты дома працаваў на полі,
Пяшком палі вайны прайшоў.

Ты, як прыпала, харчаваўся,
Хоць пот не пакідаў твой лоб.
Ды ўсё прайшоў-прапоўз, прарваўся,
Прабег з акопа ды ў акоп.

Ты здолеў у Берлін дабрацца
Адным з найпершых, Беласад,
Хоць на рэйхстазе распісацца
Табе не выпала, салдат.

Ты паў у логаве разбою,
І хай рэйхстага не дапяў —
Скрозь распісаўся ты крывёю,
Па ўсёй зямлі, што вызваляў.

Калі ў Берлін я прыязджаю,
Дык, сэрца здзейснячы наказ,
У Трэптаў-парку пазіраю
На помнік.
                    Быццам ты якраз!

Я добра ведаю і месца,
Дзе пахаваны ты ляжыш,
Ды мне ж усё,
                    усё здаецца,
Што з дзіцем гэта ты стаіш.

Тваё імя я тут чытаю,
Дзе разам мы з табой жылі,—
Мы славім вас і ўспамінаем,
Дзе б вы далёка ні былі.

Хто ўспамінае бацьку, сына,
А хто братоў, сясцёр сваіх...
А колькі іх па ўсёй Айчыне,
Такіх узгоркаў дарагіх,

Якія ў гонар родных, блізкіх
Узняў савецкі чалавек,

Дзе запісаны ў абелісках
Імёны вашы ўсе навек.

Мы славім вас,
хто ноч развеяў,
У неўміручасці імён,—
Хто ля Дуная паў, ля Шпрэе,
Хто дома пёс фашыстам скон.

Мы славім
плёнам працавітым,
Паверхам, што ўзвышае дом,
Мы славім
коласам налітым,
Паэм узбуджаным радком;

І новай домнай,
так нагрэтай,
Што выплаўляе сталь як след,
І той касмічнаю ракетай,
Што раскрывае нам сусвет;

Усім,
здабытым сёння намі,
Зрабіць што здолеў чалавек,—
Пустынь зацвіўшымі садамі,
Плацінамі магутных рэк;

Машын бясконцай чарадою,
Чароўнай мастака рукой,
А найгалоўнае —
сваёю
Крыштальна чыстаю душой.

Мы чвэрць стагоддзя вольна сеем...
Як наша зерне ўзрасло!
Стаю пры вас.
Ужо цямнее.
На захад сонца наплыло.

Яно ж на сілу не слабее,
Пайшло ў далейшы кругаход...
Так наш і Ленін — не старэе,
Хоць яму сёлета сто год.

# III
# ВЕРШЫ

## ПАМЯЦІ ГЕРОЯЎ

Хто страціў бацьку, брата, сына...
Іх шмат недачакалі мы.
Яны ад Волгі да Берліна
Адбілі ўсё сваймі грудзьмі.

Іх зрэдку па адным хавалі,
У братніх могілках яны,
Калі б усе, што леглі, ўсталі,—
Ніколі б не было вайны.

Салдаты мужнасці, адвагі,
Крыві нямала пралілі,
Калі б пафарбаваць ёй сцягі —
Усю б планету спавілі.

## РУСКІ Ў КОСМАСЕ

Ён чалавек. Ды ўвысь узмаху
Ніхто такога не зрабіў,
І вось ён першы, быццам птаха,
Пархнуўшы з карабля, паплыў.
Сусвет прад ім. Але дарога
Даўно ўжо вывучана ім —
Адзін, як бог, і нават богу
Не давялося быць такім.
Між зор нязвыклых пралятае,
Арбіты невядомы круг.
Адзін. Ды побач, адчувае,
Ёсць камандзір яго і друг.
Сяброўская ідзе размова
Аб тым, як што і след зрабіць —
І рускае важкае слова
На ўсю Галактыку гучыць.
І свет глядзіць, што за нагода
На нечуваны той палёт —
Плыве ў бяздонні сын народа,
А што за волат той народ!

## САЛДАТЫ

Адгулі віхуры ў сорак пятым,
Хай бы ім ніколі не прыйсці,
Дык сядай, бывалыя салдаты,
Пагаворым шчыра аб жыцці.
Дваццаць год, а толькі ўчора быццам
Скончылі нялёгкі мы паход —
Першае, чым можам
пахваліцца,
Што за малайчына наш народ.
Кожны кажа: добра ваявалі,
Бо, як вораг рушыўся да нас,
Недаелі мы і недаспалі,
Надавалі ж катам і ў запас.
Знаюць, паспыталі нашу сілу,
Хто ж ізноў, як той бандыт, крычыць,
Гэта з тых, каго адна магіла
Можа назаўсёды навучыць.
Не, не пусцім іх да нашай хаты,
Можам раду добрую знайсці,
Дык сядай, бывалыя салдаты,
Пагаворым шчыра аб жыцці.
Як Радзіма наша працавала,
Як натхнёна працаваў народ —
Дваццаць год. І зроблена
нямала,
Хоць у гэтым наша кроў і
пот.
Мы праходзім сямімільным
крокам,
У народа-волата пастаць,
Ну, а што ўзляцелі мы
высока —
Можа ўсім і месяц расказаць.
Мы жадаем брацкай дружбы
шчыра,
Нашы мары — толькі ў міры жыць,
У руках у нас паходня міру
Над усёй планетаю гарыць.

З кожным годам множыцца
багацце
І для ўсіх жаданае відно,
Нашы грудзі поўныя ад
шчасця,
Ды яшчэ трывожыць нас
адно —
Хтосьці кліча на змаганне
з намі,
Хтосьці кліча выйсці супраць
нас,
Ну, а выйдуць — выйдзем мы
з сынамі,
Так ударым і ў апошні раз!

## ДЖОН РЫД

Сніцца мне,— і гэта не прывід,—
Мабыць, мара выплыла мая —
Ад сцяны Крамля пайшоў Джон Рыд,
Шмат дзе з ім страчаюся і я.

А Джон Рыд прыйшоў
у Вашынгтон,
Не таму, што змусіла нуда,
Хмура ён глядзіць на Пентагон,
Ад каго на свет уся бяда.

Ў Джона Рыда нескончоны шлях,
З дзён дзяцінства вырас ён такім,
З неграмі ідзе ў адных радах,
Негры Алабамы сёння з ім.

Ён народ даўно пакінуў свой,
Быццам да свабоды на зары,
А паміж в'етнамцаў у Донг-Хой,
Дзівіцца, што ў небе за звяры?

Землякі. Не верыцца яму,
Ды глядзіць пад бомбаў гул
і свіст —
Гэта з тых, што садзяць у турму
Ўсіх, хто кажа горда: камуніст!

Што ж ты вырабляеш,
Уол-стрыт,
Згінеш сам, хоць кінеш чорны след,
Верыць у наступнае Джон Рыд —
Будзе жыць Амерыка як след.

* * *

З нас кожны з тайнаю сваёй.
Вось я іду,
іду — маўчу.
Ніхто не бачыць, што са мной.
А я да болю
так хачу,
Каб сёння з Ільічом між нас
Жылі і Пушкін
і Талстой,
Каб першы я ўзляцеў на Марс,
Навек мы скончылі
з вайной!
І на буржуя прыйдзе звод.
Буржуем
пудзіла завуць.
Кастрычніку —
аж трыста год!
Са мной сябры.
І я жыву!..
Эх, мары, мары...
Мой жа твар
сцвярджае: я часовы госць.
Зямля й мяне з праўдзівых мар
Забера гэткага,
як ёсць.

* * *

Пакуль жывём, датуль шукаем.
Знаходкам рады мы сваім,
Ды не відаць адкрыццям краю,
Як і канца не бачна ім.

Ах, як усё яно складана —
Сусвет... і песня салаўя...
Яшчэ як след не разгаданы
Шляхі пчалы і мураўя.

## НАДЗЕЯ

Як з чорнай ночы, праз завеі,
Імкнеш патрапіць да святла —
Вядзі мяне, мая надзея,
Як і дагэтуль ты вяла.

Няхай праз боль і перашкоды,
Праз непамыснасці ў жыцці —
Мяне прыводзіла заўсёды,
Куды хацелася прыйсці.

Як сэрца кліч і гарт саспеюць,
Правер ты накірунак свой —
Заўсёды спраўдзіцца надзея,
Калі дапамагаеш ёй.

* * *

Як шротам, кроплі дажджавыя
Павыбілі дарог пяскі.
І паразвесілі рабіны
Свае чырвоныя сцяжкі.

Празрысты ранак на ігліцах
Паначапляў з крышталю слёз
І павуцінне, быццам струны,
Напяў паміж яліп, бяроз.

Пажоўклы ліст пад гоман ветру
Пацалаваў маё вакно...
Чакае сэрца
І чагосьці
Зашмат трывожыцца яно.

* * *

Малым, шукаўшы разумення,
Ці летнім днём, ці ў снегавей,
І я стаяў у задуменні —
А што за лесам, што далей?..

Пазнаў нямала за жыццё я,
А больш хацелася б, глыбей,
Як бы і сёння прада мною —
А што за лесам, што далей?..

## МАРЫ

Няўжо часіна ўжо такая,
Што я цікавасць мог згубіць,—
Цябе не ведаю,
Не знаю,
Але ты мусіш,
Мусіш быць!

Я не апошні і не першы,
Я клікаю цябе адну...
Бо, як і ўсе,
Зіму сустрэўшы,
Я мару прагна
Пра вясну!

* * *

У век адкрыццяў знамянальных
З машынамі яно лягчэй,
Ды без электравылічальнай
Кахаюць так, як і раней.

Яно, бясспрэчна, вельмі зручна
У час наш вынаходны жыць,
Але ж і тэхніцы выключнай
Удараў сэрца не злічыць.

Калі пакліча хто сягоння,
Абы жар сэрца не пагас,
Я і без розных электронаў
З'яўлюся ў самы пэўны час.

Сватамі аўтаматы сталі,
Цікава ўсё, як ні кажы;
Мы ж лепш сяброўак выбіралі —
Пачуццямі сваёй душы.

# КАМЕНТАРЫІ

Чацвёрты том Збору твораў Петруся Броўкі складаецца з трох раздзелаў. У першы раздзел уваходзяць вершы перыяду 1965—1972 гг., у другі — паэма «Дума аб бессмяротнасці». Трэці раздзел складаецца з вершаў гэтага ж перыяду, якія раней па розных прычынах не былі ўключаны аўтарам у асобныя зборнікі і Зборы твораў.

Усе творы падаюцца ў храналагічным парадку паводле даты напісання. Калі адсутнічаюць дакументальныя матэрыялы, якія могуць пацвердзіць дату напісання верша, твор падаецца па даце першай публікацыі. У выпадках, калі крыніца першадруку таго ці іншага верша не выяўлена, указваецца зборнік, у які ўпершыню быў уключаны дадзены твор.

Крыніцай асноўнага тэксту з'яўляецца тэкст 3 і 4 тамоў апошняга прыжыццёвага выдання Збору твораў: Броўка Пятрусь. Збор твораў: У 7 т.— Мн.: Маст. літ., 1976.— Т. 3. Вершы і паэмы.— С. 616 (1958—1968); 1977.— Т. 4. Вершы і паэмы.— С. 576 (1968—1976).

Паколькі для большасці твораў, змешчаных у дадзеным томе, крыніца асноўнага тэксту адна і тая ж, у каментарыях да кожнага твора яна не ўказваецца. Адзначаюцца крыніца першай публікацыі і дата напісання. Усе выключэнні агавораны.

Крыніцамі для вызначэння дакладнага аўтарскага тэксту з'яўляюцца:

I.1. Рукапісныя і машынапісныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі [1].

Рукапісныя тэксты часцей за ўсё напісаны на лістках з розных блакнотаў алоўкам ці чарнілам. Машынапісы аддрукаваны на стандартнай паперы. Праўкі ў рукапісных і машынапісных тэкстах зроблены алоўкам і чарнілам.

Рукапісы і машынапісы без правак у асноўным супадаюць з тэкстам першадрукаваных крыніц.

2. Выразкі з часопісаў і газет з аўтарскімі датамі.

II. Прыжыццёвыя друкаваныя зборнікі.

1. Між чырвоных рабін: Вершы.— Мн.: Беларусь, 1969.
2. Калі ласка: Вершы.— Мн.: Беларусь, 1972.
3. Ты — мая пчолка: (Лірыка).— Мн.: Беларусь, 1972.
4. І ўдзень і ўночы: Нов. кн. лірыкі.— Мн.: Маст. літ., 1974.
5. Што сэрца праспявала: Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1979.
6. І маладосць і сталасць: Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1980.

III. Збор твораў: У 4 т.— Мн.: Беларусь, 1966.— Т. 3.

---

[1] Паколькі ўсе рукапісныя і машынапісныя матэрыялы захоўваюцца ў Літаратурным музеі П. Броўкі, месца знаходжання іх у каментарыях не называецца.

IV. Перыядычныя выданні.

Часопісы «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», «Работніца і сялянка», «Бярозка», «Вясёлка», «Вожык»; газеты «Звязда», «Мінская праўда», «Літаратура і мастацтва», «Сельская газета», «Чырвоная змена», «Вячэрні Мінск», «Советская Белоруссия».

У выніку аналітычнай зверкі ў асноўны тэкст унесены папраўкі, пашыраны і ўдакладнены даты напісання многіх вершаў.

---

У творчасці Петруся Броўкі другой паловы 60-х — пачатку 70-х гадоў найбольш плённа праявілася мастацкая якасць, якую ў свой час са здзіўленнем і добрай зайздрасцю адзначаў Міхаіл Святлоў: «Ніякай перашкоды паміж ім і чытачом. Ні адно ўзвышша, ні адна рака не раздзяляюць іх» [1]. Сапраўды, не часта сустрэнеш такую блізкасць паэта і яго адрасата, якая стварае ўражанне амаль фізічнай прысутнасці ў вершы вобраза чытача: сядзіць ён, здаецца, поруч з аўтарам, суладна, душэўна, разумеючы ўсё з паўслова, гамоніць з ім пра самае важнае, дарагое, запаветнае. «Дай пагаворым па душы»,— звяртаецца да яго паэт, запрашаючы да сааўтарства, імкнучыся да такой ступені ўзаемаразумення ў вершы, «калі адчуе ледзь не кожны, што быццам сам яго стварыў».

Гэта арганічная рыса паэзіі Броўкі змагла найпаўней рэалізавацца менавіта ў адзначаны перыяд, у кнігах «Між чырвоных рабін» (1969), «Калі ласка» (1972), «Ты — мая пчолка» (1972), «І ўдзень і ўночы» (1974), «Што сэрца праспявала» (1979), «І маладосць і сталасць» (1980), бо шчасліва супала з агульным накірункам жыцця і паэзіі да дэмакратызацыі і гуманізацыі, калі, па словах В. Бечыка, «сам тон простай і адкрытай размовы, даверлівай споведзі стаў важнейшай эстэтычнай якасцю» [2].

Якім чынам дасягае паэт такой ступені даверу і ўзаемаразумення? Відаць, вялікую ролю адыгрывае тут увага і спагада да кожнага чалавека, і характэрная для лірыкі Броўкі задушэўная, спавядальная інтанацыя, і форма звароту да чытача. Але найпершае значэнне мае атмасфера поўнага даверу і шчырасці, якая пануе ў вершах, сам вобраз лірычнага героя вельмі блізкі да канкрэтна-біяграфічнай асобы аўтара. Паэт нідзе не выдумвае, не прыхарошвае сябе, не становіцца ў позу ідэальнага героя. Ён паўстае перад намі як рэальны, канкрэтны, жывы чалавек — са сваёй неспакойнай, ранімай і чуйнай душою («Спакою не знайду нідзе, бо я, як тое кола ў млыне,— то міг на сонцы, то ў вадзе»), са сваімі радасцямі і расчараваннямі, сумненнямі і болем, у змаганні з часам, з хваробаю, з самім сабою («Крыўдна — што дні, як хвіліны, прахадзяць, // Крыўда — што сам не зрабіў чаго трэба!»). Паэт усёй душою супраць парадпай застыгласці, бронзавай манументальнасці вобраза (верш «Вось узялі, падсумавалі...»). Ён падкрэслівае жывую незавершанасць, няўрымслівасць, неардынарнасць харак-

---

[1] Светлов М. Беседует поэт. М., 1968. С. 78.
[2] Бечык В. Прад высокаю красою... Мн., 1984. С. 20.

тару лірычнага героя, часам яго несумяшчальнасць з агульнапрынятымі меркамі і канонамі.

Аднак пры гэтым вобраз лірычнага героя не здрабняецца, не мізэрнее, не зыходзіць да прыватнага, бытавога самавыяўлення, дзякуючы суадпаведнасці паэзіі і лёсу, значнасці, неардынарнасці рэальнай асобы самога паэта, якому не трэба выдумваць сябе, каб быць цікавым чытачу.

Маштабнасць, значнасць вобраза лірычнага героя дасягаецца таксама дзякуючы арганічнай злітнасці яго з народным лёсам, адчуванню свайго сціплага, але патрэбнага месца на дрэве народнага жыцця: «Народ, што акіян зялёны. А я адзіны ў ім лісток... І я яму хоць кроплю сонца сваімі вуснамі лаўлю». У вершы «Я чалавек» вобраз героя, не губляючы канкрэтнай прымацаванасці да рэальнага характару, часу, падзей, вырастае ў велічыню абагульнена-маштабную — спалучэнне асабістага, народнага, агульначалавечага:

Радзіўся я на Беларусі,
Так, як і ўсе, касіў, араў...
Ніколі ні прад кім не гнуўся,
Свой розум ёсць,
Не пазычаў.

Уклад жыцця майго — працоўны:
У час заснуць, устаць з зарой.
Сярод людзей я памяркоўны,
Але і маю
Гонар свой!

Народнасць творчасці Броўкі праяўляецца не толькі ў вобразе лірычнага героя. Шматаблічная, шматгранная, яна вызначае і характар мастацкага светабачання, і прынцып паэтыкі,— глыбінна народны погляд на працу, на хлеб, на духоўныя каштоўнасці жыцця, своеасаблівы, задушэўна-песенны лад вымаўлення, прастату, дакладнасць, афарыстычнасць слова, нацыянальную адметнасць мастацкага вобраза. У вершы «*** З нас кожны кругагляд свой мае...» паэт раскрывае своеасаблівасць вобразнага бачання народа, абумоўленую прыродай, ладам жыцця — кругаглядам, прасторай, тымі маякамі-арыенцірамі, якія ўвасабляюць сутнасць народнага духу. «Мой друг заўсёды пачынае ад стромых гор свае радкі»,— піша ён. «Мы ж пачынаем па-другому, і вобразаў іншы ход,— мы ўсе ля бору, як вядома, і ад яго і слоў палёт». Сапраўды, многае ў паэзіі Броўкі пачынаецца «ад бору», нават калі ў вершы не ідзе аб ім размова,— але ёсць шматстайны гул жыцця, стойкасць, няломнасць, узвышанасць, карані якой — у роднай зямлі, шчырасць, непадробнасць («шчыры бор» — значыць, чысты, з адных гонкіх соснаў), неад'емнасць ад грамады, народа.

Народнасць творчасці Броўкі — не этнаграфічна-павярхоўная, а глыбока ўнутраная якасць. Народныя погляды, маральныя прынцыпы правераны і асэнсаваны багатым асабістым жыццёвым вопытам, а таму маюць не агульна-адцягнены характар, а своеасаблівае-індывідуальнае, канкрэтна-жыццёвае, кожны раз непаўторнае выпаўненне. Нават калі паэт прыходзіць да агульнавядомых высноў, ён мае права сказаць: «Я гэта ўсё жыццём праверыў». Добра

напісаў аб гэтым М. Ярош у манаграфіі пра паэта: «Лад народных думак, крытэрыі маральных ацэнак, своеасаблівасць светаадчування, непаўторнасць звычаяў, вышыня народнага эстэтычнага ідэалу — усё гэта, успрынятае яшчэ па-дзіцячаму стыхійна і напаўсвядома, адчутае на парозе творчай сталасці, асэнсаванае праз гады творчай працы, увайшло ў мастацкі набытак Броўкі, склала важную частку яго жыццёвага і духоўнага вопыту» [1].

Патрыятызм як адна з асноўных праяў народнасці паэзіі Броўкі таксама мае глыбока ўнутраны, інтымны характар. Яго творчасць гэтага перыяду, за рэдкімі выключэннямі, амаль пазбаўляецца казённа-рытарычных услаўленняў радзімы, размова пра родны край набывае асабістасць і задушэўнасць, выцякае, па словах паэта, «з глыбінь душы». Варта прыгадаць верш «Чаму я гэтак вас люблю?», які стаў ужо класічным узорам патрыятычнай лірыкі. Любоў паэта да роднага краю пягучпая, крыху сарамлівая (як і кожнае сапраўднае пачуццё), але пяшчотна-задушэўная інтанацыя, здзіўленне перад някідкім харaством прыроды гавораць куды больш гучных прызнанняў. У сваёй інтымнасці, пранікнёнасці, задушэўнасці любоў да родных мясцін арганічна спалучаецца з пачуццём да каханай (верш «Прыязджай»):

Ах, якія штогод і вясна там і лецечка,
Што ні гай, што ні куст — салаўіны дамок.
Прыязджай, паглядзі, як жа скача там рэчачка
З крамянька-камянька на другі камянёк.

Аднак улюбёнасць у Радзіму ў Броўкі не сузіральна-ідылічная. Родны край для яго «не толькі Мекка, ды і Галгофа разам з тым... Я ж дзень пры дні яму малюся, то крыж нясу я за яго». Драматычныя ноткі з'яўляюцца ў творах паэта не толькі тады, калі ён піша пра мінулае Беларусі або, скажам, пра суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны. Такія вершы, як «*** Хмурнеюць мае напевы...», сведчаць аб тым, што паэт бачыў у 60—70-я гады тыя негатыўныя працэсы, аб якіх мы адкрыта гаворым зараз. Ён чуйна ўлоўліваў небяспеку, «калі на цвітучае дрэва насунецца раптам тля», і быў супраць замоўчвання недахопаў, марных ідылічных спадзяванняў, «што гэта хвароба часу, што гэта само міне». «Давайце ж будзем адкрыта чорнае чорным зваць»,— у гэтым закліку паэта — суадпаведнасць пафасу перабудовы, галоснасці, сённяшнім нашым трывогам і надзеям.

З глыбінь народнага светаадчування вынікае і характар філасафічнасці, якая стала адметнай своеасаблівасцю паэзіі П. Броўкі 60—70-х гадоў. У вершах «Спіць зерне...», «Жолуд», «*** Восень, бабіна лета...», «*** Зямля! Гляджу на ўсё жывое...» і іншых паэт у духу натурфіласофіі суадносіць жыццё чалавека і прыроды, іх «поры года», паказвае жыццё ў яго вечным кругазвароце, невычэрпнасці, незнішчонасці:

Зямля! Гляджу на ўсё жывое,
гляджу на дрэвы, на траву,
І я між іх, табой узняты, тваімі сокамі жыву.
Карэннямі ў глыбі сабраны, святло світальнае я стрэў,
Табой, як зерне, ўзгадаваны, узрос, напіўся і даспеў.

[1] Ярош М. Пятрусь Броўка. М., 1981. С. 80.

Своеасаблівасць філасофскай лірыкі П. Броўкі ў тым, што яна ніколі не бывае абстрагавана-адцягненай. Узвышанае, духоўнае заўсёды канкрэтызуецца, набывае адметныя, непаўторныя рысы, праекцыю на рэальны чалавечы лёс. Як правіла, першым штуршком да філасофскага роздуму становіцца нейкі канкрэтны выпадак, назіранне, перажыванне («Вецер», «*** А усё яно ідзе з малога...» і інш.). І ў той жа час у позняй лірыцы паэта і канкрэтна-бытавое, нават пабытавае прасякаецца духоўнасцю, часта набываючы абагульнена-сімвалічнае значэнне. Так, піша паэт пра звычайнае спяданне, аднаўляючы старажытную этымалогію гэтага слова — «сённяданне», падкрэсліваючы яго ўрачысты, рытуальна-абрадавы, велічны сэнс як сустрэчы сонца, новага дня. У вершы «Смачней было...» надзвычай маляўнічае апісанне дзіцячых «прысмакаў» — бульбы ў шалупінні, сыраежак, падсмажаных на кастры, пражанага бобу, вішнёвай смалы і ледзяшоў — не толькі штрыхі побыту, але і рысы часу, эпохі, і супрацьпастаўленне напаўгалоднага дзяцінства сучаснай сытасці, у якой трацішча смак не толькі да яды, але і да жыцця — «і ўсё ж тады смачней было».

Шмат у якіх вершах паэт па-філасофску асэнсоўвае хаду часу, вельмі востра і драматычна адчуваючы яго плыннасць і незваротнасць («*** Усё жыццё — адно імгненне...», «*** Гады адышлі, як часовыя госці...» і інш.). Ён перадае ў вершы суб'ектыўнае чалавечае адчуванне нераўнамернасці часу ў дзяцінстве і маладосці, калі ён ідзе марудна, калі яго прыспешваеш: «Ах, каб хутчэй ўсё ішло!», і хуткацечнае мільганне ў другой палове жыцця:

Сябры, юначыя галовы,
Не трэба дзён тых падганяць,
Бо на другой жыцця палове
Дні матылямі мільгацяць.
...Ледзь ранак бліснуў, а ўжо вечар,
Ледзь год пачаўся — год мінуў.

Паэтычнае ўяўленне афарбоўвае кожны час у свой колер: «Красаванне», «У шарую гадзіну», «Шчаслівая гадзіна». У вострым адчуванні імклівасці і незваротнасці часу, імкненні пераадолець час асабістым жыццём і лёсам бачыцца пераклічка лірыкі П. Броўкі з паэзіяй А. Куляшова. Аднак мастацкая канцэпцыя часу ў паэтаў адрозная, што тлумачыцца рэалістычнай дамінантай светаадчування аднаго паэта і рамантычнай тэндэнцыяй — у другога. У Броўкі не сустрэнеш куляшоўскіх глабальных, імгненных часавых зрухаў, сумяшчэнняў, зваротаў, адкрытасці, разнасцежанасці часу («На паўмільярдным кіламетры паміж наступным і былым»); куляшоўскага «часу ў часе», калі супадаюць стрэлкі асабістага і ўсеагульнага, касмічнага «гадзінніка». П. Броўка ўспрымае час у яго эпічнай канкрэтнай хадзе з мінулага ў будучыню, не прапускаючы звенняў, не забягаючы наперад. Яго мары аб вяртанні часу — толькі лірычны прыём, які не адбіваецца ў паэтыцы. Наадварот, паэт любіць паказваць паслядоўнае развіццё вобраза ў рухомай плыні часу — паступовыя змены, пералівы, адлюстраванні («Камень», «Крыніца»).

Натуральна, у позняй лірыцы Броўкі тэма часу вырашаецца як суадносіны маладосці і сталасці ў жыцці чалавека. «І маладосць і сталасць» — так названы і адзін са зборнікаў паэта. Тут гучыць

і шчымлівы светлы сум, і бадзёрасць, аптымізм, і лёгкая ўсмешка, самаіронія.

Паэт усё часцей звяртаецца да сваёй маладосці, якая супала з маладосцю Краіны Саветаў,— рэвалюцыяй, вялікімі сацыяльнымі пераўтварэннямі. Падзеі таго часу ўспамінаюцца ў непаўторнай канкрэтнасці дэталяў, якія захавалі сам дух эпохі, і ў той жа час рамантычна-ўзнёсла («Валрэўкомаўскі кур'ер», «Першыя спектаклі», «Ячэйка», «Вясёлка» і інш.). Часам з лёгкай усмешкай згадваючы юнацкі максімалізм, наіўнасць свайго пакалення, паэт сцвярджае вернасць ідэалам маладосці.

Зварот П. Броўкі да тэмы юнацтва — не проста настальгія па былым і далёкім часе сіл, надзей і красавання. Ранне, вясна, маладосць як ранак жыцця мае ў паэтычнай сістэме Броўкі асаблівае значэнне. Паэт, па ўспамінах, вельмі любіў ранак, заўсёды сустракаў усход сонца. І тут нешта большае, чым звычка,— глыбінная сувязь з народнай традыцыяй, абраднасцю, павер'ямі, што ранкам прылятае да чалавека душа, вяртаецца яго маладосць: «Які ж ты, ранак, маладзенькі, з табою сам я малады»; «Пастаўце сонейку па ўсход, па сэрцы я — юначых год!». Нават запаветныя, шчымлівыя па сваёй душэўнай шчырасці думкі аб людской памяці, водгуку праз гады ў сэрцах нашчадкаў паэт звязвае з вясною, з абуджэннем, адраджэннем жыцця:

Я ведаю, час прыйдзе гэткі —
Усё прачнецца пры вясне,
Як матылі, успыхнуць кветкі...
І нехта ўспомніць пра мяне.

Да філасофскай лірыкі поўным чынам набліжаюцца і вершы-павучанні, маральныя ўрокі, запаветы («Гора — горы», «Дабро» і інш.). У гэтых вершах моцны дыдактычны элемент, аднак гучаць яны без залішняй катэгарычнасці, без навязвання чытачу сваіх думак— спакойна, удумліва, нераканальна. Права на павучанне дае паэту багаты жыццёвы вопыт, які, у сукупнасці з вопытам народным, становіцца квітэсенцыяй чалавечай мудрасці, разважлівасці. Як мудра і глыбока, напрыклад, гаворыць паэт пра дабро, якое павінна быць не паказным, не крыклівым, ісці не ад розуму, а ад сэрца, ад натуры чалавека:

Дабро зрабіў — не гойкай пеўнем.
Дарунак — большая краса,
Дары, як колас — дорыць зерне,
Як вільгаць — летняя раса.

Дыдактычныя вершы — гэта не толькі разважліва-спакойнае павучанне, але і сцверджанне, упушэнне, заклік, палеміка, дзе сам рытм, гучанне будзяць, запальваюць, настройваюць на змаганне, пераадоленне: «У навальніцу», «А ты ідзі!», «Быць камуністам...», «Абы-якой не заставайся!».

Поўны зрух да філасафічнасці назіраецца і ў публіцыстычнай лірыцы Броўкі, якая ўвайшла ў 4-ты том Збору твораў. Праўда, у ёй па-ранейшаму сустракаюцца і выдаткі рыторыкі, просталінейнай дэкларацыйнасці, банальных «агульных месц» (вершы «Гарніст», «У Ленінградзе», «Чырвоныя следапыты», «Чапаі па вуліцы ідзе...» і інш.). Часам паэт проста лічыў сваім абавязкам адгукнуцца на нейкую падзею ці дату, і адгукаўся, хоць глыбінныя струны яго душы заставаліся маўклівымі. Аднак у яго лепшых

публіцыстычных вершах гэтага часу ёсць і глыбокія думкі, і сапраўдны боль душы. Да прыкладу, верш «Скаргі зямлі»,— з глабальнай сімвалічнай вобразнасцю, моцным антываенным пафасам, душэўнай узрушанасцю і болем. Паэт у сне як бы ўздымаецца над маці-зямлёй і бачыць яе, спакутаваную, здратаваную шматлікімі войнамі, усю зраненую снарадамі, бомбамі, напалмам, чуе яе скаргі і ў прадчуванні атамных апакаліптычных жахаў вуснамі самой зямлі заклікае яе няўдзячных дзяцей да міру і згоды.

Многія вершы П. Броўкі гэтага часу, як і ранейшыя яго творы, напісаны паводле рэальных фактаў і падзей — ці гэта сустрэча з цікавым чалавекам, ці выпадак асабістага жыцця, ці падзея ў жыцці краіны. Лірыку паэта працізвае пафас асабістай далучанасці да падзей у краіне: «Мне да ўсяго сягоння справа, усё мне блізка да душы». Паэт любіць канкрэтыку, дакладнасць дэталяў. Напрыклад, у вершы «Ташкент — ты ў сэрцы!», расказваючы пра землятрус у Ташкенце, пра моц дружбы народаў, якая перамагла стыхію, паэт не забывае адзначыць дакладны час катастрофы, калі спыніліся ў горадзе ўсе гадзіннікі — пяць дваццаць тры.

Аднак у лірыцы апошніх дзесяцігоддзяў узаемадачыненні з фактам, падзеяй, канкрэтыкай становяцца ўсё больш свабоднымі, апасродкаванымі, непрыкметнымі на першы погляд. Паэт усё больш імкнецца да філасофіі факта, да яго духоўнай высновы, звяртаецца, хоць і не часта, да сімволікі, умоўнасці.

Лірызацыя, паглыбленне філасофскага пачатку — адметныя рысы вершаў П. Броўкі, якія ўвайшлі ў 4-ты том новага Збору твораў. Аднак гэтым не вычэрпваецца яго мастацкая палітра, дыяпазон паэтычнага голасу. Душу сваю паэт нездарма параўноўвае ў адным з вершаў са скрыпкаю, дзе ёсць шмат струн — ад грымотнай да найтанчэйшай, «што чуе, як нясе травінка, што чуе, як нясе сасна». П. Глебка пісаў пра яго: «дыяпазон жанру і паэтычнага голасу паэта надзвычай вялікі: ён прасціраецца... ад высокай патэтыкі да самай пяшчотнай лірыкі» [1]. Сама музыка верша, яго непаўторная інтанацыя мае асабліваe значэнне ў творчасці П. Броўкі. Часам інтанацыяй ён гаворыць намнога больш, чым прамым лагічным і нават вобразным значэннем слова. Музыка верша ўздымае звычайнае, здавалася б, бытавое выказванне ў высокую сферу паэзіі. Да прыкладу, у вершы «Ніцая вярба» паўторамі слоў, якія ствараюць своеасаблівы шматузроўневы рытм, самой інтанацыяй, сінтаксічнай будовай радка перададзена і нарастанне эмацыянальнай узрушанасці, захаплення, замілавання, і лёгкі пошум зялёнага мяккага ветру, у які ператварылася вярба — любімае дрэва народных песень:

> Ах, вярба мая, вярба, вербачка, вярбінка!
> Ах, якая ж у цябе зялёная хусцінка!
> Нікнуць долу валасы аж да травінак,
> Тысячамі, тысячамі зялёных ручаінак,
> Сыплеш слёзы ты вясной і ў зялёным леце,
> І сама пад ветрам ты, як зялёны вецер.

Голас паэта набывае найтанчэйшую нюансавасць адценняў, мяккасць і цеплыню гучання, песенную элегічнасць, калі ён размаўляе з сябрам, з каханай, калі душа яго адгукаецца на таемныя гукі прыроды.

---

[1] Глебка П. Паэзія барацьбы і перамогі. Мн., 1973. С. 63.

Шматлікія вершы паэта напісаны ў размоўна-апавядальным ключы — ён працягвае даўнюю ў беларускай паэзіі традыцыю вершаванага апавядання. Вершаваным апавяданнем можна назваць і паэму «Дума аб бессмяротнасці», дзе паэт расказвае пра герояў, якія загінулі ў змаганні за Радзіму, сцвярджае іх бессмяротнасць у сэрцах і справах нашчадкаў. На жаль, паэма не стала значнай з'явай паэзіі, чаму перашкодзілі апісальнасць, дэкларацыйнасць, адсутнасць лірычнага сюжэта, развіцця дзеяння, глыбокага душэўнага ўзрушэння.

У голасе П. Броўкі часта гучаць сатырычныя ноткі, іронія, сарказм. Паэт стварыў своеасаблівую «партрэтную галерэю» прыстасаванцаў, двурушнікаў, дармаедаў, паклёпнікаў. У вершах «Манюка», «Брахуны», «Пляткар», «Мутняр», «*** Прыйдзе час — такіх не будзе...» і інш. прыцягвае ўвагу востры іранічны падтэкст, трапная, афарыстычная з'едлівасць і псіхалагічная дакладнасць характарыстык. Вось як трапна сказана пра псеўдаінтэлектуала: «У ім нямнога інтэлекту, ледзь-ледзь хапае для эфекту». Або вось паэт «спачувае» прыстасаванцу:

У меру пруткі, ў меру крохкі,
Між дзён бурлівых ён плыве.
І хоць, відаць, яму нялёгка,
Пакуль што лёгка ён жыве.

Аднак у вершах сатырычнага плана П. Броўка, у адрозненне, напрыклад, ад П. Панчанкі, нідзе не карыстаецца гіпербалай, не звяртаецца да гратэскавага завастрэння вобраза ці з'явы. Відаць, справа тут не толькі ў тым, што Броўка, дапусцім, адносіўся да негатыўных праяў жыцця больш спакойна і памяркоўна, а найперш у своеасаблівасці мастацкага светаадчування паэта, асновай якога была гарманічная цэласнасць быцця, пачуццё меры. П. Броўка не прымае рамантычных перабольшванняў, завастрэнняў нейкага аднаго боку жыцця ці з'явы, нічога «звыш». «Ва ўсім, сябры, патрэбна мера, ва ўсім залішні перабор»,— выказвае ён сваё запаветнае крэда ў праграмным вершы, які так і называецца — «Мера».

Аднак, як мы бачым з яго твораў, меру паэт разумеў не як абмежаванасць парыванняў, славутую «залатую сярэдзіну», а найперш як поўнае (але не празмернае) праяўленне жыццёвых сіл і магчымасцей, суладнасць чалавека з прыродай, гармонію з людзьмі і светам. Меры этычнай павінна, на яго думку, адпавядаць і мера эстэтычная. Такую суадпаведнасць, гармонію формы і зместу, «поўную меру» прыродных сіл і духоўнага жыцця чалавека бачым мы ў вершы «***Як лета ўбярэцца...», у многіх іншых творах паэта.

Абвостраным пачуццём меры, гармоніі тлумачыцца імкненне паэта, асабліва ў яго сталай лірыцы, да класічнай прастаты, ураўнаважанасці формы і зместу. Ён не прымае мастацкія «лішкі», празмернасці — «у вершах — лішняя шліфоўка... зашмат эпітэтаў, рыфмоўкі,— так нараджаецца рыфмач». Сапраўды, у вершах паэта троп не набывае самастойнага значэння, не вытыркаецца са зместу. Гэту непрыкметнасць мастацкага элемента ў змесце твора як сакрэт класічнай прастаты паэзіі Броўкі падкрэсліваў У. Гніламёдаў, аналізуючы верш «Калі надыдзе час спачыну»: «У згаданым вершы паэта майстэрства проста незаўважнае, яно — арганічная ўласцівасць паэтычнай думкі... Уражанне такое, што для паэта праблемы формы проста не існуе. Яна такая ж неадымная частка

яго свядомасці, як і сам змест, можна сказаць, адзіны спосаб існавання гэтага зместу»[1].

Паэтычнае майстэрства П. Броўкі раўнамерна праяўляецца на ўсіх узроўнях структуры твора — і ў гукапісе, і ў вобразнасці, і ў самой архітэктоніцы верша. Будова верша ў паэта таксама шмат у чым абумоўлена народным, гарманічным ладам светаадчування, пачуццём прапорцыі і меры. Найчасцей звяртаецца паэт да кальцавой, гарманічна закончанай будовы — узнікае нейкая думка, вобраз, потым яна паслядоўна разгортваецца ў часе, узбагачаецца лірычнымі асацыяцыямі, каб зноў паўстаць у канцы верша ўжо ў новай іпастасі, як выснова, вынік, падагульненне. Цікавае само размяшчэнне вершаў у томе, якое спалучае храналагічны прынцып з тэматычным. Як мы бачым, П. Броўка пісаў вершы своеасаблівымі лірычнымі цыкламі, дзе ў розных ракурсах, іпастасях раскрываў пэўную думку, вобраз, пачуццё. Адзін верш нараджае другі, асацыятыўна пераклікаецца з ім, ствараючы ілюзію жывой, нязмушанай гаворкі, якая не заканчваецца на старонках кнігі, а мае працяг у рэальным жыцці. І мы зноўку чуем шчыры, даверлівы, пранікнёны голас паэта, быццам ён звяртаецца да кожнага з нас, сваіх чытачоў: «Дай пагаворым па душы...»

ТАМАРА ЧАБАН

[1] Гіламёдаў У. Дум палёт узнёслы. Полымя, 1975, № 6. С. 214.

У сярэдзіне 60-х — пачатку 70-х гадоў творчасць П. Броўкі ўзыходзіць на новыя паэтычныя рубяжы, але паэт па-ранейшаму патрабавальны да сябе і сваіх твораў, што пацвярджаецца і выпісакамі аналітычнай зверкі. Па-ранейшаму Броўка дапрацоўваў вершы, уносячы разнастайныя праўкі, скарачаючы ці, наадварот, дапаўняючы творы. Праца паэта ў такім напрамку змяняла знешнюю і ўнутраную структуру верша, паглыбляла яго ідэйны змест, больш выразна акрэслівала стан лірычнага героя, пераключала ўвагу чытача з другараднага на галоўнае. Асаблівую ўвагу ўдзяляў паэт творам пры падрыхтоўцы іх да выдання ў асобных зборніках. Такі творчы падыход мастака да вершаў меў свае вынікі. Да чытача дайшлі адшліфаваныя і адпрацаваныя творы, у якія ўмясцілася часцінка паэтавага сэрца і таленту.

## I

## ВЕРШЫ

*** *А мой даўно імкнецца верш...* (с. 7)

Упершыню — Сов. Белоруссия, 1965, 25 чэрв.

У рукапісе пад тэкстам: Студзень, 1965 г.

*Як час мяняецца і людзі...* (с. 8)

Упершыню — Полымя, 1965, № 8.

У рукапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

*Не хачу* (с. 9)

Упершыню — Полымя, 1965, № 8.

У рукапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

*Магіла невядомага салдата* (с. 10)

Упершыню — Полымя, 1965, № 8.

У рукапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

Можна меркаваць, што верш напісаны да 20-годдзя Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

*Пільшчыкі* (с. 11)

Упершыню — Чырв. змена, 1965, 24 чэрв.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

*** *Ад цябе не прыходзяць лісты...* (с. 12)

Упершыню — Чырв. змена, 1965, 24 чэрв.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

*За акном пажар зялёны* (с. 13)

Упершыню — Магіл. праўда, 1965, 2 чэрв.

У машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

**** Прыйдзе час, такіх не будзе...* (с. 14)

Упершыню — Полымя, 1965, № 8.

У машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

**** З нас кожны кругагляд свой мае...* (с. 15)

Упершыню — Полымя, 1965, № 8.

У машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

Пры падрыхтоўцы да выдання Зб. тв., 1976 паэтам была ўнесена папраўка ў сёмы радок верша. Замест: Увысь паэт змалі ўзбіраўся // Паэт з дзяцінства ўвысь узбіраўся.

*Грузінская песня* (с. 16)

Упершыню — Полымя, 1965, № 8.

У машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

Хеўсуры — этнаграфічная група грузін (горцаў).

**** Да старэчых дзён маркоты...* (с. 17)

Упершыню — Полымя, 1965, № 8.

У машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

**** Вось узялі, падсумавалі...* (с. 18)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1965, 25 чэрв.

У машынапісе і першадруку пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

**** Вясна ўжо гурбы з ніў карчуе...* (с. 20)

Упершыню — Сов. Белоруссия, 1965, 25 чэрв.

У машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

**** Нямала і ў яго клапотаў...* (с. 21)

Упершыню — Вожык, 1965, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: Красавік, 1965 г.

Тэкст друкуецца з папраўкай па выданні: Броўка П. Збор твораў. У 4 т. Т. 3.— Мн.: Беларусь, 1966.

С. 21, радок 9, замест: Дзе быць, як сталь, упартым, // Дзе быць, як тая сталь, упартым.

*Крыўдна* (с. 22)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1965 годам.

У машынапісе пад загалоўкам «Крыўда» пад тэкстам: Ліпень, 1965 г.

*Дыпламат* (с. 23)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У машынапісе пад загалоўкам «Наш дыпламат» пад тэкстам: Жнівень, 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 недакладна датуецца 1966 годам.

Можна меркаваць, што ў названых выданнях гэты і некаторыя іншыя вершы («*** А думы, думы роем-роем...», «*** Ты ўся у трывозе, маладая...», «Палкоўнік» і інш.) датаваліся не годам іх напісання, а годам апублікавання.

Пры падрыхтоўцы верша да першай публікацыі паэт замяніў загаловак: замест «Наш дыпламат» з'явілася — «Дыпламат».

**** А думы, думы роем-роем...* (с. 25)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У машынапісе пад тэкстам: Жнівень, 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв.,

т. 3 недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*** *Ты шчодрая, зямля-планета...* (с. 26)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У рукапісе датуецца 1965 годам, у машынапісе пад тэкстам: Жнівень, 1965 г.

Пры падрыхтоўцы да выдання Зб. тв., 1976 паэт перапрацаваў апошнюю страфу. Замест: Праз нейкі час ~ слапа. // Гады ідуць. Ты назіраеш, (І кожны для цябе — што госць.) Пасля ж назад ты забіраеш — / Усіх як ёсць, усіх як ёсць!

*** *Ты ўся ў трывозе, маладая...* (с. 27)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У машынапісе пад тэкстам: Жнівень, 1965 г.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*«Палкоўнік»* (с. 28)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1966, 8 лют.

У машынапісе пад тэкстам: Жнівень, 1965 г. У зб. «Між чырвоных рабін» недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

Ладунка — сумка для пораху; у метафарычным значэнні — пакункі з харчовымі запасамі.

*** *Сэрца тугою нязведанай поўнячы...* (с. 30)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У машынапісе пад тэкстам: Жнівень, 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*** *Цябе я зваў заўсёды мілай...* (с. 31)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У рукапісе пад тэкстам: Верасень, 1965 г., у машынапісе — Кастрычнік, 1965 г. Дата ў машынапісе — вынік пазнейшай перапрацоўкі тэксту верша.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*Імем рэспублікі* (с. 32)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У рукапісе пад тэкстам: Верасень, 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*** *Восень, бабіна лета, лёг туман на траву...* (с. 33)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Верасень, 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*Бярэзінскі запаведнік* (с. 34)

Упершыню — Бярозка, 1965, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: Верасень, 1965 г.

*** *А восень пайзванчэй, чым далей...* (с. 37)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У машынапісе пад тэкстам: Кастрычнік, 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

У вершы знайшла адлюстраванне народная традыцыя, паводле якой вяселлі на вёсцы спраўляліся восенню, пасля заканчэння сельскагаспадарчых работ.

*** *Я сяджу над радком. Хіліць вецер кусты...* (с. 38)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У машынапісе над тэкстам: Кастрычнік, 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*Скрыпка* (с. 39)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У машынапісе пад тэкстам: Кастрычнік. 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв.. т. 3 недакладна датуеца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

Верш у перакладзе на рускую мову пакладзены на музыку кампазітарам Б. Будзько.

*Добра ўсюды нарадзіцца...* (с. 40)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

У машынапісе пад тэкстам: Кастрычнік, 1965 г. Першапачатковы загаловак «Добра ўсім...» закрэслены і папраўлены на «Добра ўсюды нарадзіцца...».

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

Тэкст друкуецца з папраўкай на часоп. «Полымя». 1966, № 2.

С. 40, радкі 7—8, замест: Ды пакуль разважаў, кім жа лепш нарадзіцца. /Запрашаюць на свята, а сардэчна так, міла... // Ды пакуль разважаў, кім жа лепш нарадзіцца, /Мне прыслалі пісьмо з-за Саянаў, з Кызыла:/ Запрашаюць на свята, а сардэчна так, міла...

Пры падрыхтоўцы верша да публікацыі паэт перапрацаваў некалькі радкоў.

С. 40, радкі 6—9, замест: Свой у кожнага кут ~ а сардэчна так, міла... // Добра кожнаму з нас, хто ў свой кут закаханы, /Добра ўсім, хто ў сям'і нашай роднай з'яднаны, /Толькі я працаваны, гэтак будзе напэўна, /Калі ты нарадзіўся чалавекам сумленным!

Чангуры — маецца на ўвазе чанг — узбекскі і таджыкскі музычны інструмент — род цымбалаў.

*Агні Кастрычніка* (с. 42)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1966, 8 лют.

У машынапісе пад тэкстам: Кастрычнік, 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*Белы рамонак* (с. 43)

Упершыню — Маладосць, 1966, № 4.

У рукапісе пад тэкстам: Лістапад, 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

Пры падрыхтоўцы да выдання зб. «Між чырвоных рабін» паэт унёс праўку ў трэці радок верша. Замест: Даўно ў юнацтве, як мы з табою, і ўсе варажылі // Помніш, у юнацтве як мы з табою ўсе гаварылі.

*Шчаслівая гадзіна* (с. 44)

Упершыню — Маладосць, 1966, № 4.

У рукапісе пад тэкстам: Лістапад, 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*Гора — горы* (с. 45)

Упершыню — Маладосць, 1966, № 4.

У рукапісе пад тэкстам: Лістапад, 1965 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*Шлях песні* (с. 46)

Упершыню — Беларусь, 1966, № 7 з датай пад тэкстам: 1956—66 гг.

У рукапісе пад тэкстам: Лістапад, 1965 г.

Відавочна, што першая дата пад тэкстам верша з'яўляецца фактычнай памылкай. Тут трэба ўсё-такі чытаць: 1965. Пацверджаннем гэтаму, па-першае, з'яўляецца тое, што не выяўлены ні рукапісы, ні машынапісы верша, датаваныя 1956 годам, па-другое, сярод твораў П. Броўкі няма ніводнага, які б не быў апублікаваны на працягу 9—10 гадоў.

Паколькі ў архіве не выяўлены таксама матэрыялы перапрацоўкі тэксту верша пазней лістапада 1965 г., з'яўленне ў даце твора 1966 года можна растлумачыць тым, што менавіта ў гэтым годзе твор рыхтаваўся да першай публікацыі.

*Камень* (с. 47)

Упершыню — Беларусь, 1966, № 7.

У рукапісе пад тэкстам: Лістапад, 1965 г.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*А ты ідзі!* (с. 49)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1965 годам.

У адным з рукапісаў пад тэкстам: Лістапад, 1965 г., у другім — XI. 1965 г. Тэксты абодвух рукапісаў ідэнтычныя.

*Будзь верны!* (с. 50)

Упершыню — Маладосць, 1966, № 4.

У рукапісе пад тэкстам: Лістапад, 1965 г.

Пры падрыхтоўцы да выдання Зб. тв., 1976 паэт унёс адзіную праўку ў тэкст верша.

С. 50, радок 17, замест: Святой і светлай роднай хаце/ Святлейшай ў свеце роднай хаце.

*** *Калі ўвечар скончыш працу і дадому ты ідзеш...* (с. 51)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1965 годам.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Лістапад, 1965 г.

*З дзён маленства* (с. 52)

Упершыню — Маладосць, 1966, № 4.

У рукапісе пад тэкстам: Лістапад, 1965 г.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях недакладна датуецца 1966 годам.

Пры надрыхтоўцы да выдання зб. «Між чырвоных рабін» паэт унёс у тэкст верша некалькі правак. Напрыклад, замест: За ўсіх жа больш, пэўна, Ленін, // А большы за ўсіх, вядома, Ленін.

*Валрэўкомаўскі кур'ер* (с. 54)

Упершыню — Маладосць, 1966, № 4.

У рукапісе пад тэкстам: Лістапад, 1965 г.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях недакладна датуецца 1966 годам. (Гл. камент. да верша «Дыпламат».)

*Цяжкі настрой* (с. 56)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1965 годам.

У рукапісе пад тэкстам: 1965 г.

*** *Паміж лясnымі шатамі...* (с. 57)

Упершыню — Беларусь, 1966, № 4.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: 1965 г.

Загаловак у рукапісе «Кім былі, чым сталі?» закрэслены.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 памылкова датуецца 1967 годам. Звестак аб перапрацоўцы верша на працягу 1965—1967 гг. не выяўлена.

*Я прашу цябе, мастацтва...* (с. 59)

Упершыню — Сельская газ., 1965, 25 чэрв. пад загалоўкам «Роздум». Верш змешчаны пад рубрыкай: «60 год з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі. Новыя вершы юбіляра».

У рукапісе і машынапісе пад гэтым жа загалоўкам датуецца 1965 годам.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях недакладна датуецца 1966 годам. Звестак аб перапрацоўцы верша ў 1966 годзе не выяўлена. Загаловак — «Я прашу цябе, мастацтва» — упершыню з'явіўся ў зб. «Між чырвоных рабін».

*У навальніцу* (с. 60)

Упершыню — Сельская газ., 1965, 25 чэрв. пад рубрыкай: «60 год з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі. Новыя вершы юбіляра».

У рукапісе і машынапісе, дзе загаловак верша адсутнічае, а таксама ў Зб. тв., 1966 твор датуецца 1965 годам.

*** *Бадзёры я і рухам шустры...* (с. 61)

Упершыню — Беларусь, 1965, № 6.

У рукапісе, машынапісе і Зб. тв., 1966 датуецца 1965 годам.

*Нагарода* (с. 62)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1965, 9 ліп.

У рукапісе, машынапісе і Зб. тв., 1966 датуецца 1965 годам.

*Кропля крыві* (с. 63)

Упершыню — Звязда, 1965, 25 чэрв., разам з іншымі матэрыяламі, прысвечанымі 60-годдзю П. У. Броўкі.

У рукапісе і Зб. тв., 1966 датуецца 1965 годам.

*З глыбінь грудзей* (с. 64)

Упершыню — Беларусь, 1966, № 7 без загалоўка.

У рукапісе і ў зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1965 годам. Загаловак верша ўпершыню з'явіўся ў названым зборніку.

*Адрасы* (с. 65)

Упершыню — Беларусь, 1965, № 6.

У машынапісе і Зб. тв., 1966 датуецца 1965 годам.

*Красаванне* (с. 66)

Упершыню — Маладосць, 1965, № 6.

У машынапісе і Зб. тв., 1966 датуецца 1965 годам.

*Манюка* (с. 67)

Упершыню — Вожык, 1965, № 11.

У машынапісе і Зб. тв., 1966 датуецца 1965 годам.

*Багата, родная ты мова...* (с. 69)

Упершыню — Звязда, 1965, 25 чэрв. разам з іншымі матэрыяламі, прысвечанымі 60-годдзю П. Броўкі.

У машынапісе і ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1965 годам.

Тэкст друкуецца з папраўкай па часоп. «Полымя», 1965, № 8.

С. 69, радок 15, замест: Дзяўчынку лічым мы бярозкай, // Дзяўчыну лічым мы бярозкай.

*** *Есць людзі цвёрдага спакою...* (с. 70)

Упершыню — Сов. Белоруссия, 1965, 25 чэрв.

У машынапісе і ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1965 годам.

*Струны* (с. 71)

Упершыню — Маладосць, 1965, № 6.

У машынапісе і ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1965 годам.

*** *Люблю вітаць вясны спатканне...* (с. 72)

Упершыню — Полымя, 1965, № 8.

У Зб. тв., 1966 датуецца 1965 годам.

Пры падрыхтоўцы да выдання апошняга прыжыццёвага Зб. тв., т. 3 паэт направіў апошні радок чацвёртай страфы. Замест: Брацъ неба цягнуцца ў палон // Імкнуцца неба ўзяць у палон

*Скаргі зямлі* (с. 73)

Упершыню — Полымя, 1965, № 8.

У Зб. тв., 1966 датуецца 1965 годам.

*** *Пражыць, як гавораць,— не поле прайсці...* (с. 75)

Упершыню — Полымя, 1965, № 8.

У Зб. тв., 1966 датуецца 1965 годам.

*** *Куды, маладосць, адыходзіш упрочкі...* (с. 76)

Упершыню — Зб. тв., 1976, т. 3, дзе датуецца 1965 годам. У зборнікі верш не ўключаўся.

*Я вас аднолькава люблю...* (с. 77)

Упершыню — Зб. тв., 1976, т. 3, дзе датуецца 1965 годам. У зборнікі верш не ўключаўся.

*Заявы* (с. 79)

Упершыню — Вожык, 1966, № 9.

У рукапісе пад тэкстам: Люты, 1936 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 недакладна датуецца 1967 годам. Звестак аб перапрацоўцы тэксту верша ў 1967 годзе не выяўлена.

*** *Свет, ён вялікі, бязмежны...* (с. 80)

Упершыню — Полымя, 1966, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: 29.V.66 г.

*** *Адкуль вятры паналяцелі...* (с. 81)

Упершыню — Полымя, 1966, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: 11.VI.66 г.

*** *Ты шчодры будзь! Хтось не забудзе...* (с. 82)

Упершыню — Полымя, 1966, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: 11.VII.66 г.

*** *Бомбы, снарады і газы шугаюць...* (с. 83)

Упершыню — Полымя, 1966, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: 20.VII.66 г.

Пры падрыхтоўцы да выдання зб. «Між чырвоных рабін» пасля слоў «Не павярнуцца ніколі назад» была апушчана страфа: Колькі ж у свеце дарэмна іх гіне!/ Як жа мільёнам пра гэта сказаць? /Мабыць, што ноч разарваць на часціны /І ўсім па кавалку жалобы раздаць.

*Размова з Дзвіною* (с. 84)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1966, 9 жн. з датай пад тэкстам: Ліпень. 1966 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1966 годам.

Пры падрыхтоўцы да выдання зб. «Між чырвоных рабін» паэт перапрацаваў два радкі.

С. 84, радкі 19—20, замест: Над іх мурамі новы горад /Узняўся вышэй над Дзвіной. // Ды ўсё закрэсліў новы год, / Што сёння ўзняўся над Дзвіной.

*Ты глянь з Сафійскае гары* — Узвышэнне ў Полацку, на якім пабудаваны Сафійскі сабор. Помнік архітэктуры 2-й пал. XI—XVIII ст. Пабудаваны ў 1044—66 гг. як праваслаўны храм.

*Над іх мурамі новы горад / Узняўся вышай над Дзвіной.*— Гаворка ідзе пра Наваполацк. Асноўныя прадпрыемствы: Полацкі нафтаперапрацоўчы завод, Полацкі хімічны камбінат, завод жалезабетонных вырабаў, ЦЭЦ.

Скарына Францыск (каля 1490—1551) — беларускі першадрукар, вучоны, асветнік і культурны дзеяч, перакладчык і пісьменнік эпохі Адраджэння.

*Парог* (с. 85)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1967, 11 ліп.

У рукапісе пад тэкстам: 4.X.1966 г.

Пры падрыхтоўцы да выдання зб. «Між чырвоных рабін» паэт унёс у тэкст верша пешматлікія праўкі. Напрыклад:

С. 85, радок 8, замест: Мне ж пазразаныя сучкі, як быццам вочы, свецяць // А мне ягоныя сучкі, як быццам вочы, свецяць.

*З ветрам наросхрыст* (с. 86)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1966 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 31.XII.—1966 г.

*** *Ды, мабыць, я і не адзіны...* (с. 87)

Упершыню — Беларусь. 1966, № 7.

У рукапісе і ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1966 годам.

*Як мая бабка на Ефрасінню хадзіла...* (с. 88)

Упершыню — Вожык, 1966, № 9.

У машынапісе датуецца 1966 годам. Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях недакладна датуецца 1967 годам. Звестак аб перапрацоўцы тэксту верша ў 1967 годзе не выяўлена.

*Больш святое Ефрасінні/ Не было ў яе святой...*— Маецца на ўвазе Ефрасіння Полацкая — свецкае імя Прадслава (1110)? (—1173) — князёўна, ігуменя манастыра св. Спаса ў Полацку, асветніца перыяду Кіеўскай Русі, першая жанчына на Русі, якую царква кананізавала ў святыя.

*Пераўтварэнне* (с. 90)

Упершыню — Беларусь, 1966, № 4.

У машынапісе, зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв. недакладна датуецца 1967 годам. Звестак аб перапрацоўцы верша ў 1967 годзе не выяўлена.

*...што пад намі цуд — не соль.*— Маюцца на ўвазе калійныя і каменныя солі Старобінскага радовішча.

*** *Я не магу таго забыцца...* (с. 91)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1967, 7 сак.

У машынапісе і зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1966 годам.

*Тайны* (с. 92)

Упершыню — Беларусь, 1967, № 3.

У машынапісе і ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1966 годам.

*** *Сусвет, ён мае сваю мову...* (с. 93)

Упершыню — Беларусь, 1967, № 9.

У машынапісе і зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1966 годам.

*Дудар* (с. 94)

Упершыню — Беларусь, 1967, № 9.

У машынапісе і зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1966 годам.

*Характары* (с. 95)

Упершыню — Беларусь, 1967, № 9.

У машынапісе і зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1966 годам.

*Ташкент — ты ў сэрцы!* (с. 96)

Упершыню — Звязда, 1966, 1 верас.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1966 годам.

*Пры першым удары і я быў вясною з табою...*— У час землятрусу ў Ташкенце ў красавіку 1966 года Пятрусь Броўка знаходзіўся

там у якасці члена беларускай дэлегацыі, якая прымала ўдзел у Дэкадзе беларускай літаратуры і мастацтва ва Узбекістане.

*Дзіўны тэатр Наваі* — тэатр оперы і балета імя Алішэра Наваі.

Гафур Гулям (Гулям, 1903—1966) — народны паэт Узбекскай ССР. Лаўрэат Дзяржаўнай (1946) і Ленінскай прэміі (1970, пасмяротна).

Улугбек Мухамед Тарагай (1394—1449) — узбекскі астраном і матэматык. З 1409 г. правіцель Самарканда. Шмат зрабіў для развіцця навукі і культуры ў Сярэдняй Азіі.

Руставелі Шата (гады нараджэння і смерці невядомы) — грузінскі паэт, аўтар сусветна вядомай паэмы «Віцязь у тыгравай шкуры». Паводле меркаванняў даследчыкаў парадзіўся ў канцы 60-х або ў пач. 70-х гадоў XII ст.

Абай Кунанбаеў (1845—1904) — паэт-асветнік, зачынальнік новай казахскай пісьмовай літаратуры. Светапогляд фарміраваўся пад уплывам гуманістычных ідэй вялікіх паэтаў і вучоных Усходу, рускай класічнай літаратуры і старажытнагрэчаскіх філосафаў.

Айні (псеўданім Садрыдзіна Саідмурадавіча, 1878—1954) — таджыкскі савецкі пісьменнік, вучоны, грамадскі дзеяч. Першы прэзідэнт АН Таджыкскай ССР (з 1951). Пісаў на таджыкскай і ўзбекскай мовах. Заснавальнік таджыкскай і адзін з зачынальнікаў узбекскай савецкай літаратуры.

*Я чалавек* (с. 99)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1966, 4 лістап. без загалоўка.

У зб. «Між чырвоных рабін» пад загалоўкам «Я чалавек» датуецца 1966 годам.

*Як іграюць зайчыкі...* (с. 101)

Упершыню — Полымя, 1966, № 11.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1966 годам.

*** *Здзіўляе цудам разнастайным...* (с. 102)

Упершыню — Полымя, 1966, № 11.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1966 годам.

*Пляткар* (с. 103)

Упершыню — Беларусь, 1967, № 9.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1966 годам.

*Сталасць — не старасць* (с. 104)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1966, 4 лістап.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1966 годам.

*** *Жывуць, на жаль, такія шэльмы...* (с. 105)

Упершыню — Полымя, 1966, № 11.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1966 годам.

*** *Гаворыш ты, што зніклі краскі...* (с. 106)

Упершыню — Беларусь, 1967, № 3.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1966 годам.

*А дзе яна?* (с. 107)

Упершыню — Беларусь, 1967, № 3.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1966 годам.

*Імя* (с. 108)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1967, 5 верас.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1966 годам.

*Кара* (с. 110)

Упершыню — Полымя, 1966, № 2.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1966 годам.

*Ячэйка* (с. 111)

Упершыню — Беларусь, 1966, № 4.

Датуецца годам апублікавання.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях недакладна датуецца 1967 годам. Звестак аб перапрацоўцы тэксту верша ў 1967 годзе не выяўлена.

*Не заставайся ты адзін...* (с. 112)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 22.I.1967 г.

*Таварыш* (с. 113)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 30.I.67 г.

*Жыццё — карабель* (с. 114)

Упершыню — Полымя, 1967, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: 31.I.1967 г.

*А Ленін нам кажа...* (с. 115)

Упершыню — Полымя, 1967, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: 1.II.67 г.

Можна меркаваць, што гэты і іншыя вершы («Сцяна крамлёўская», «Першы камісар», «Салдатам рэвалюцыі») напісаны да 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

*Герой* (с. 117)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 11.2.1967 г.

*** *Хочацца верыць, а можа, й не верыцца...* (с. 119)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 4.III.1967 г.

*** *Спачатку выблісне жаданне...* (с. 120)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 8.III.1967 г.

*** *Ну што ж, вядома, пастарэў...* (с. 121)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 20.III.1967 г.

*Чакаю...* (с. 122)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 28.III.1967 г.

*Ніцая вярба* (с. 123)

Упершыню — Полымя, 1967, № 12.

У машынапісе пад загалоўкам «Плакучая вярба» пад тэкстам: 30. III. 1967 г.

*Чарговая размова са шпаком* (с. 124)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 5.IV.1967 г.

*Як плакалі лісты...* (с. 125)

Упершыню — Полымя, 1967, № 12.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1967 г.

Загаловак у машынапісе з'явіўся пазней. Ён надпісаны зверху простым алоўкам.

*** *Толькі ранне ў вокнах...* (с. 126)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1967.

*Споведзь* (с. 127)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1967.

*Свята* (с. 128)

Упершыню — Полымя, 1967, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1967 г.

*** *Калі ў бядзе ты вінаваты...* (с. 129)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1967 г.

*** *Паэт, часоў сваіх дазорца...* (с. 130)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1967 г.

*Пяро* (с. 131)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1967 г.

*** *Я чую, як коціцца...* (с. 132)

Упершыню — Полымя, 1967, № 12.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1967 г.

*Курганы славы* (с. 133)

Упершыню — Полымя, 1967, № 11.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1967 г.

Пры падрыхтоўцы верша да першай публікацыі паэт унёс у тэкст некалькі правак.

С. 133, радок 9, замест: Ёсць танкісты, што гарэлі, як ішлі з баямі // Ёсць танкісты, што гарэлі, а часамі мерзлі.

Радок 10, замест: Пехацінцы, што прыкрылі ўсю зямлю грудзямі // Пехацінцы, што палеткі скрозь грудзьмі прапоўзлі.

*Сцяна крамлёўская* (с. 134)

Упершыню — Полымя, 1967, № 11.

У рукапісе і машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1967 г.

Загаловак у машынапісе, відаць, з'явіўся пазней. Ён надпісаны зверху простым алоўкам.

*Першы камісар* (с. 135)

Упершыню — Полымя, 1967, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1967 г.

Пры падрыхтоўцы тэксту верша да першай публікацыі паэт перапрацаваў некалькі радкоў.

С. 135, радкі 5—8, замест: Думна раіцца ~ праз гады // Ён стаіць перад усімі/ Дзейсны, малады,/ І ў мяне перад вачыма/ Праз усе гады

*** *Вечар ціхі, зоры ў зборы...* (с. 136)

Упершыню — Полымя, 1967, № 12.

У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1967 г.

*Салдат рэвалюцыі* (с. 137)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 3—6.X.1967 г.

Пры падрыхтоўцы да выдання зб. «Між чырвоных рабін» паэт скараціў верш пасля слоў «І брызентовы патранташ», апусціўшы наступныя радкі: Ён рэвалюцыі салдат./ Чырвонай арміі байцом/ Быў на франтах./ І мнагакрат/ Быў паміж смерцю і жыццём./ Яго нявечыў польскі пан,/ Зваліць хацеў Дзянікін з ног,/ І хоць ён меў нямала ран,/ Ды канчаткова перамог! і пасля слоў «І партызанскія бары»: Ён рэвалюцыі салдат,/ Да долу голаў не схіліў./ Ну, што ж, усё разбурыў кат,/ Ды ўсё з сябрамі аднавіў./Пасталі зноўку гарады,/ Скрозь забуяла, загуло,/ Закрасаваліся сады,/ Так, як ніколі не было.

*На сваёй зямлі* (с. 139)

Упершыню — Полымя, 1967, № 11.

У машынапісе пад тэкстам: Чэрвень, 1967 г.

Загаловак у машынапісе, відаць, з'явіўся пазней. Ён надпісаны зверху простым алоўкам.

Тэкст друкуецца з папраўкай па часоп. «Полымя», 1967, № 11.

С. 139, радок 17, замест: І сумных нас вы не шукайце/ І сумных ў нас вы не шукайце.

*** *Мы выйшлі з цямноты, нядолі і гора...* (с. 141)

Упершыню — Полымя, 1967, № 11.

У машынапісах пад тэкстам: Ліпень, 1967 г.

Пры падрыхтоўцы тэксту верша да публікацыі паэт унёс праўку ў шосты радок. Замест: З'ядналіся. Разам наперад нам плыць. // Магутнай сям'ёю навечна нам жыць.

*** *Цікіх вестак, дзень не першы...* (с. 142)

Упершыню — Полымя, 1967, № 12.

У машынапісах пад тэкстам: Ліпень, 1967 г.

*Аэра* (с. 143)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: Ліпень, 1967 г.

*У трубы трубіце!..* (с. 144)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісах пад тэкстам: Ліпень, 1967 г.

*Асенні вецер* (с. 145)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 10.IX.1967 г.

*** *Больш не магу. Даю зарок...* (с. 146)

Упершыню — Маладосць, 1968, № 1.

У машынапісе пад тэкстам: 30.IX.1967 г. Цхалтуба.

*** *А я сабе азначыў зорку...* (с. 147)

Упершыню — Маладосць, 1968, № 1.

У машынапісе пад тэкстам: 8.X.1967 г.

*Скнара* (с. 148)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У адным з машынапісаў датуецца 1967 годам, у другім пад тэкстам: 13.X.1967 г.

*** *Няхай бы лепей быў мароз...* (с. 149)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

Адзін з машынапісаў датуецца 1967 годам, у другім з першым радком — «Ды хай бы лепей быў мароз...» — пад тэкстам: 13.X.1967 г.

*** *Дзяруць, бывае, дарма глотку...* (с. 150)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе пад тэкстам: 23.XI. 1967 г.

Пры падрыхтоўцы да выдання зб. «Між чырвоных рабін» паэт унёс праўку ў перадапошні радок верша. Замест: Каб нізавошта быў ён біты // Калі б ён сам быў дарма біты.

*Позняя восень* (с. 151)

Упершыню — Полымя, 1968, № 4.

У машынапісе пад тэкстам: 26.XI.1967 г.

*** *Яно чым далей-болей...* (с. 152)

Упершыню — Полымя, 1968, № 4.

У машынапісе пад тэкстам: 5.XII.1967 г.

*** *Я пераж**ыў** трывог нямала...* (с. 153)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У рукапісе і зб. «Што сэрца праспявала» датуецца 1967 годам.

*Пра чырвоную зорку* (с. 154)

Упершыню — Вяч. Мінск, 1967, 31 снеж.

У рукапісе і зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

*Іначай размова з буслам* (с. 155)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе і зб. «І маладосць і сталасць» датуецца 1967 годам.

*** *«Джы-ай» ваюе. Што ён стрэне?..* (с. 156)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе датуецца 1967 годам.

Джы-ай — афіцыйная назва салдата ў амерыканскай арміі.

*Спаць не давала мне Карэя...* — Гаворка ідзе пра падзеі 1950—1953 гг. у Карэі. 25 чэрвеня 1950 г. паўднёва-карэйская ваеншчына развязала ваенныя дзеянні супраць КНДР. ЗША адразу ўмяшаліся ва ўнутраны канфлікт. На заклік Працоўнай партыі Карэі народ КНДР узняўся на Айчынную вызваленчую вайну. КНДР падтрымалі СССР, КНР і іншыя сацыялістычныя краіны, а таксама прагрэсіўныя сілы ўсяго свету. Агрэсары былі вымушаны пайсці на заключэнне перамір'я, якое адбылося 27 ліпеня 1953 г.

*Спаць не дае цяпер В'етнам...* — Маецца на ўвазе вайна супраць В'етнама ЗША, якія ў 1964—1965 гг. разгарнулі паветраную вайну супраць ДРВ. У 1965 г. яны ўвялі ў Паўднёвы В'етнам войскі, узялі на сябе непасрэднае вядзенне вайны супраць патрыятычных сіл. У 1969 г. быў створаны Часовы рэвалюцыйны ўрад Рэспублікі Паўднёвы В'етнам. Дзякуючы гераізму в'етнамскага народа, які падтрымлівалі СССР і іншыя сацыялістычныя краіны, а таксама прагрэсіўныя сілы свету, амерыканская агрэсія ў В'етнаме правалілася.

*** *А ўсё яно ідзе з малога...* (с. 157)

Упершыню — Маладосць, 1968, № 1 пад загалоўкам «Усё пачынаецца з малога».

У машынапісе і ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1967 годам.

Пры падрыхтоўцы да выдання зб. «Між чырвоных рабін» загаловак верша быў зняты.

*Гэта маё сэрца* (с. 158)

Упершыню — Звязда, 1968, 17 лют.

У машынапісе і зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

*** *Снягамі з поўначы задзьмула...* (с. 159)

Упершыню — Полымя, 1968, № 4. Тут верш пачынаецца радком — «Вятрамі з поўначы задзьмула....».

У машынапісе і ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1967 годам.

Пры падрыхтоўцы верша да выдання ў зб. «Між чырвоных рабін» паэт унёс праўку ў другую страфу. Замест: Адной мятлюзе ~ не разлічыць // Адной мятлюзе быццам трэба/ Кружыць з віднa і да віднa./ Дзе поля край, пачатак неба?/ Глядзіш — усюды сівізна.

*** *Дзе ад старасці падзецца...* (с. 160)

Упершыню — Полымя, 1968, № 4.

У машынапісе і зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

Пры падрыхтоўцы тэксту верша да публікацыі паэт перапрацаваў трэцюю страфу, унёс праўкі ў другую і чацвёртую строфы.

С. 160, радок 5, замест: Што старому? // Час старога —

радкі 9—12, замест: А я вось які бываю: ~ За качулкаю бягу. // А я вось пра вошта мару:/ Каб свісток з лазы садраць,/ Змея запусціць над хмары/ І качулку пакачаць,

радок 13, замест: Дзень праводжу ля рачулкі/ Пасядзець бы ля рачулкі.

*** *Ну я, вядома, не герой...* (с. 161)

Упершыню — Полымя, 1968, № 4.

У машынапісе і ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1967 годам.

*** *Вядома мне: яно не нова...* (с 162)

Упершыню — Полымя, 1968, № 4.

У машынапісах і зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

*Купалля кветкі.*— Маецца на ўвазе, што ў купальскую ноч (з 23 на 24 чэрв.) дзяўчаты плялі вянкі з кветак, пускалі іх на ваду, марачы пра будучае замужжа. Адным з найбольш паэтычных купальскіх павер'яў-легендаў была легенда пра папараць-кветку. Яна па-мастацку ўвасобіла мару чалавека пра шчаслівае жыццё.

*** *Якімі б ні ішоў шляхамі...* (с. 163)

Упершыню — Полымя, 1968, № 4.

У машынапісах і зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

Пры падрыхтоўцы верша да першай публікацыі паэт унёс праўку ў апошні радок. Замест: Мае хлапцы — з маёй зямлі. // На нашай роднае зямлі.

*** *Задума першая мая...* (с. 164)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

У машынапісе і зб. «Што сэрца праспявала» датуецца 1967 годам.

*У Ленінградзе* (с. 165)

Упершыню — Звязда, 1967, 7 студз.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

*Ода зубру* (с. 167)

Упершыню — Беларусь, 1967, № 9.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

Кароль Аўгуст III (1696—1763) — кароль польскі і курфюрст саксонскі з 1733 г. Праўленне Аўгуста III — час палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай.

*...князь Ягела...* (Ягайла Уладзіслаў, каля 1350—1434) — вялікі князь літоўскі ў 1377—1392, кароль польскі з 1386 г, заснавальнік дынастыі Ягелонаў.

*** *Мастацтву ў нас прастор вялікі...* (с. 169)

Упершыню — Сельская газ., 1968, 3 лют.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

*Стары горад* (с. 170)

Упершыню — Маладосць, 1968, № 1 пад загалоўкам «У старым горадзе».

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам. Тут упершыню верш друкуецца пад загалоўкам «Стары горад».

*** *Каб розум перабраць я мог...* (с. 171)

Упершыню — Маладосць, 1968, № 1.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

*Хлеб* (с. 172)

Упершыню — Звязда, 1967, 7 студз.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

**** Зямля! Гляджу на ўсё жывое...* (с. 173)

Упершыню — Маладосць, 1968, № 1 пад загалоўкам «Зямля мая».

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам. Пры падрыхтоўцы да выдання зборніка загаловак верша быў зняты.

*Чырвоныя следапыты* (с. 174)

Упершыню — Вяч. Мінск, 1968, 6 лют.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

*У шарую гадзіну* (с. 175)

Упершыню — Полымя, 1968, № 4 пад загалоўкам «Шлях».

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам. Тут упершыню верш друкуецца пад загалоўкам «У шарую гадзіну».

*Купалаўцам* (с. 176)

Упершыню — Звязда, 1967, 24 сак.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

*Ветэран* (с. 177)

Упершыню — Звязда, 1967, 24 сак.

У зб. «Між чырвоных рабін» датуецца 1967 годам.

*А ён жа помніць ~ Курлова губернатара і расстраляны год.*— Маецца на ўвазе расстрэл царскімі войскамі і паліцыяй мітынгу працоўных Мінска 18.10.1905 г.

Рабочыя Мінска актыўна ўдзельнічалі ў Кастрычніцкай усерасійскай стачцы. Каб задушыць стачку, губернатар Мінска П. Р. Курлоў на парадзе ваенных улад і гарнізона параіў ужыць зброю. 18 кастрычніка адбыўся мітынг чыгуначнікаў. Да іх далучыліся каля 10 тыс. чалавек. Па патрабаванню ўдзельнікаў мітынгу Курлоў вызваліў палітвязняў, але аддаў загад расстраляць бяззбройных рабочых. Было забіта больш за 50 чалавек і шмат паранена.

*Паміж пахіленых бяроз* (с. 179)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

*Ноч* (с. 180)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1967 годам.

*Быў я селькорам* (с. 181)

Упершыню — Сельская газ., 1968, 3 лют. пад загалоўкам «Я быў селькорам».

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1967 годам.

Загаловак — «Быў я селькорам» — упершыню з'явіўся ў зб. «Між чырвоных рабін».

*Верасень* (с. 182)

Упершыню — Маладосць, 1968, № 1.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1967 годам.

**** Каму Памір, каму Ай-Петры...* (с. 183)

Упершыню — Між чырвоных рабін, 1969, дзе датуецца 1967 годам.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1967 годам.

*** *Крыніца побліз маёй вёскі...* (с. 184)

Упершыню — Маладосць, 1968, № 1 пад загалоўкам «Крыніца ў роднай вёсцы».

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1967 годам.

Пры падрыхтоўцы да выдання зб. «Між чырвоных рабін» загаловак верша быў зняты.

*Партызанскі тэлеграф* (с. 185)

Упершыню — Маладосць, 1968, № 1.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1967 годам.

*Лясныя рыцары* (с. 186)

Упершыню — Звязда, 1967, 7 студз.

Ва ўсіх прыжыццёвых выданнях датуецца 1967 годам.

*** *Відаць, ніколі не забыцца...* (с. 187)

Упершыню — Полымя, 1968, № 4.

У рукапісе пад тэкстам: 24.I.68 г.

У зб. «Між чырвоных рабін» і апошнім прыжыццёвым Зб. тв., т. 3 недакладна датуецца 1967 годам. Звестак пра тое, што верш быў напісаны ў 1967 годзе, не выяўлена.

*** *Пад вераснёўскімі лістамі...* (с. 188)

Упершыню — Беларусь, 1968, № 9.

У машынапісе пад тэкстам: II.1968 г.

*Даруй!* (с. 189)

Упершыню — Беларусь, 1968, № 9.

У машынапісе пад тэкстам: II.1968.

*** *Клапот нямала і ў салдата...* (с. 190)

Упершыню — Беларусь, 1968, № 9.

У машынапісе пад тэкстам: II.1968 г.

*Прыязджай* (с. 191)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1968, 6 верас.

У машынапісе пад тэкстам: III. 1968 г.

*** *А час імклівы недарэчы...* (с. 192)

Упершыню — Літ. і мастацтва, 1968, 6 верас.

У машынапісе пад тэкстам: III. 1968 г.

*** *Свайго ты слова не стрымала...* (с. 193)

Упершыню — Беларусь, 1968, № 9.

У машынапісе пад тэкстам: III. 1968 г.

*** *Як да бярна бярно кладзецца...* (с. 194)

